Пролетарыі усіх краін, злучайцеся!

# Работніца і Калгасьніца

Б2272

№ 3 (148)
Студзень
1932 г.

# За ўсеагульнае дашкольнае выхаванне

## Хутчэйшай арганізацыяй дашкольнай каапэрацыі прыцягнем грамадзкасьць да палепшаньня свайго бытавога абслугоўваньня

Побач з агульнымі гіганцкімі посьпехамі, дасягнутымі пад кіраўніцтвам кампартыі ў справе індустрыялізацыі краіны, сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі і культурнага будаўніцтва, ёсьць значныя посьпехі і ў справе дашкольнага выхаваньня. Гэта дае магчымасьць уцягнуць шырокія жаночыя кадры ў вытворчасьць і грамадзка-палітычнае жыцьцё краіны, па другое, камуністычнае выхаваньне дашкольнікаў падрыхтоўвае дзяцей да палітэхнічнай школы.

Аднак, у параўнаньні з агульным ростам сацбудаўніцтва рост ахопу дзяцей усімі відамі дашкольных устаноў значна яшчэ адстае ад агульных тэмпаў сацбудаўніцтва (усяго ў 1931 годзе ахоплена 13 проц. дзяцей дашкольнага ўзросту).

Аднэй з адказьнейшых задач, якую ўсклала на нас партыя, зьяўляецца ажыцьцяўленьне ў 1932 г. ўсеагульнага дашкольнага выхаваньня. На даным этапе сацбудаўніцтва лёзунг „усеагульнае дашкольнае выхаваньне" бязумоўна зьяўляецца жыцьцёвым і рэальным. 1932 год, які зьяўляецца рашаючым заключным годам пяцігодкі, у дашкольным выхаваньні зьяўляецца рашаючым у справе вырашэньня пытаньня аб адзінай сыстэме камуністычнага выхаваньня. Для ажыцьцяўленьня дашкольнага ўсеагульнага выхаваньня патрабуецца мабілізацыя ўсёй грамадзкасьці, усіх форм і мэтадаў па прыцягненьні сіл і сродкаў грамадзкасьці на дашкольнае будаўніцтва.

**Па БССР мы павінны ў 1932 годзе ахапіць дашкольнымі ўстановамі і ўсімі відамі масавай работы 316 тысяч дзяцей дашкольнага ўзросту. Тады будзе вырашана задача 100-проц. ахопу дзяцей работніц і 50-проц. дзяцей калгасьніц дашкольнымі ўстановамі. Сродкаў для гэтага патрабуецца больш 20 мільёнаў.** Трэба ўлічваць, што дзяржава без дапамогі ўсёй грамадзкасьці, аднымі бюджэтнымі сродкамі ня справіцца з гэтай задачай.

**Аднэй з лепшых форм прыцягненьня сродкаў грамадзкасьці зьяўляецца дашкольная каапэрацыя.** Разьвіцьцё яе дзейнасьці ў БССР зьяўляецца ўдарнай, неадкладнай задачай.

Дашкольная каапэрацыя гэта адна з форм самадзейнасьці працоўных у справе арганізацыі іх бытавога абслугоўваньня, аб'яднаньне сіл і сродкаў як насельніцтва, так і грамадзкасьці на справу камуністычнага дашкольнага выхаваньня дзяцей.

Задачы дашкольнай каапэрацыі трэба шырока папулярызаваць сярод працоўных, трэба асьвятляць гэта пытаньне на фабрыках і заводах, у калгасах і саўгасах, на агульных сходах і сходах дэлегатак і прыступіць да практычнай арганізацыі яе дзейнасьці.

Вопыт, які мы маем па ўсеагульным абавязковым навучаньні ў школах, павінен легчы ў аснову па вырашэньні задач усеагульнага дашкольнага выхаваньня. Аднак, ня трэба забываць, што на шляху ўсеагульнага дашкольнага выхаваньня ёсьць рад труднасьцяй, якія мы павінны перамагчы: па-першае, тое, што адсутнічаюць адпаведныя прыстасаваныя памяшканьні, няма ўважлівых адносін да складаньня фондаў забесьпячэньня харчаваньнем, абсталяваньнем і сваячасовага водпуску сродкаў з боку прафсаюзных арганізацый. Для ўрэгуляваньня ўсяго гэтага патрабуецца вельмі ўважлівая напружаная работа як з боку НКА, так і ўсіх гаспадарчых, прафсаюзных і калгасных арганізацый. Ударнымі тэмпамі трэба дабівацца складаньня фондаў па забесьпячэньні дашкольных устаноў як прадуктамі харчаваньня, так і адпаведным абсталяваньнем. Ня менш гэтага патрабуецца ўдарнасьці ў складаньні адпаведнай матар'яльнай базы для ўсеагульнага дашкольнага выхаваньня. Неабходна ўзаконеньне гэтай справы, каб кожная гаспадарчая, прафсаюзная і грамадзкая арганізацыі адчувалі адказнасьць за ажыцьцяўленьне дырэктыў партыі і ўраду па 100-проц. ахопе дашкольнага ўзросту.

Для таго, каб ахапіць камуністычным выхаваньнем 316 тысяч дзяцей у 1932 годзе, **неабходны падрыхтаваныя кадры—больш 10 тысяч дашкольніц.** Аднак, відаць, што НКА пакуль-што далей раёпрацоўкі кантрольных лічбаў не пайшоў. Калі ня будуць прыняты адпаведныя крокі да разгортваньня шырокай працы па вярбоўцы на дашкольныя курсы, могуць сарвацца тыя мерапрыемствы, якія намячаюцца на 1932 год.

Адначасова неабходна ўлічваць задачы падняцьця кваліфікацыі дашкольных работнікаў, якія стаяць на вельмі нізкай ступені і зусім не адказваюць запатрабаваньням камуністычнага выхаваньня дзяцей. І за гэту работу ўзяцца па-баявому, трэба арганізоўваць ударныя дашкольныя ўст новы па ўсіх раёнах для ўздыму якасьці мэтадычнай работы.

Неабходна зараз-жа па-баявому разгарнуць работу па ўсеагульным дашкольным выхаваньні ў адпаведнасьці з 6 умовамі тав. Сталіна, мабілізуючы шырокія дашкольныя масы на барацьбу **за якасьць працы**, па баявому разгарнуць дзейнасьць дашкольнай каапэрацыі, якая адыгрывае вялікую ролю ў ажыцьцяўленьні ўсеагульнага дашкольнага выхаваньня.

**Слонімская.**



У дзіцячым садзе Віцебскай ф-кі „Дзьвіна".

**На вокладцы: вытворчая нарада сьвінарак у калгасе імя Войкава Чырвона-слабодзкага раёну.**

*Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!*

# РАБОТНІЦА І КАЛГАСЬНІЦА БЕЛАРУСІ

СТУДЗЕНЬ 1932 год — 8-мы год выданьня — № 3

**За выкананьне пяцігодкі за чатыры гады, за пасьпяховую пабудову сацыялістычнага грамадзтва.**

**За чыстату і цьвёрдасьць ленінскай лініі нашай партыі, супроць апартунізму і прымірэнцтва да іх.**

## НА ШЛЯХУ ДА НОВЫХ ДАСЯГНЕНЬНЯЎ

Камуністычная партыя Беларусі прайшла вялікі шлях паміж XIII і XIV сваімі зьездамі. Асноўныя зрухі ў гаспадарчым жыцьці БССР характарызуюцца такімі, напрыклад, паказальнікамі: удзельная вага прамысловай прадукцыі складала ў 1930 г. 38,7 проц. у адносінах да ўсёй прадукцыі народнай гаспадаркі; у 1931 годзе гэта ўдзельная вага ўзьнялася да 50,4 проц. У сельскай гаспадарцы значна вырасьлі, пашырыліся і ўмацаваліся саўгасы; калектывізацыя, якая ахапляла да моманту XIII зьезду КП(б)Б (май 1930 г.) 11-12 проц. сялянскіх гаспадарак, узьнялася да 50,4 проц. да пачатку 1932 году. Гэта забясьпечыла пераважную ролю сацыялістычнага сэктару ў таварнай прадукцыі сельскай гаспадаркі.

Прамысловасьць БССР разьвівалася ў 1930-31 г. тэмпамі больш высокімі, чым агульнасаюзныя. Калі штогадовы прырост прадукцыі прамысловасьці па Саюзе на працягу першых 3-х год пяцігодкі складаў 21-24 проц., то для БССР адпаведныя лічбы давалі ў 1928-29 г. — 40,8 проц., у 1930 годзе—61 проц., у 1931 г.—79 проц. Уступіў у строй дзейных фабрык і заводаў рад новых прадпрыемстваў, сярод іх—Белдрэс імя Сталіна, магілеўская фабрыка штучнага валакна, завод сельска-гаспадарчых машын у Гомелі (сіласарэзкі), віцебскія швэйная і трыкатажная фабрыкі і рад іншых. На чарзе пуск крычаўскага цэмэнтнага заводу, гомельскай мэханізаванай гуты, дрэваапрацоўчага камбінату ў Гомелі і г. д.

Адзін гэты пералік найбольш буйных аб'ектаў капітальнага будаўніцтва апошняга часу ўжо дае ўяўленьне аб напрамку разьвіцьця прамысловасьці БССР у бок выкарыстаньня мясцовых сырцовых рэсурсаў. Старое ўяўленьне аб Беларусі, як аб краіне, якая ня мае сваёй сырцовай базы для прамысловасьці, павінна быць рашуча адхілена. Моцную сырцовую бэзу ў БССР маюць дрэваапрацоўчая, папяровая, тэкстыльная (лён і штучнае валакно), шкляная, броварная, крухмальная прамысловасьць і розныя віды харчовай прамысловасьці. У бліжэйшым будучым вялікую ролю у прамысловым разьвіцьці БССР адыграюць хэмічная прамысловасьць (фасфарыты, ацэтон, лесахэмія, пераапрацоўка сапрапэлітавых пакладаў і рад іншых вытворчасьцяй), выраб будаўнічых мятар'ялаў (цэмэнт, агняўпоры, кераміка, новыя будматар'ялы) і, нарэшце, мэталяапрацоўчая прамысловасьць, якая мае ўсе пэрспэктывы для свайго разьвіцьця, апіраючыся на танны водны шлях, які зьвязвае БССР з паўднёвай мэталюргічнай базай.

Шпаркі рост прамысловасьці БССР, якая выканала сваю пяцігодку за тры з паловай гады, паставіў перад КП(б)Б ва ўвесь рост пытаньне аб энэргетычнай базе, якая забясьпечыла-б высокія тэмпы прамысловага разьвіцьця. Такой базай ва ўмовах БССР можа зьявіцца толькі торф. Ні лес, які вельмі зьменшыўся і да таго-ж багаты каштоўнымі пародамі, якія ідуць у пераапрацоўку на будаўніцтва, ні шматлікія рэкі, як правіла, якія маюць малы спад і нізкія берагі ня могуць вырашыць апалава-энэргетычную праблему БССР ня толькі для бліжэйшага будучага, але і для данага часу. Прывозны апал таксама не прадстаўляе сабою, вядома, вырашэньня гэтай праблемы. Перад КП(б)Б стаіць, такім чынам, задача асвоіць торф, як асноўную крыніцу жыўленьня электрастанцый і заводзкіх сілавых установак. Іменна пад гэтым кутом погляду зьяўляюцца асабліва недапушчальнымі тыя прарывы ў торфаздабычы, якія мелі месца летам 1931 году. Абязьлічка і ўраўнілаўка, дрэннае арганізацыйна-гаспадарчае кіраўніцтва, невыстарчальная ўвага з боку раду партарганізацый да гэтых пытаньняў былі асноўнымі прычынамі, якія абумовілі гэтыя прарывы.

Праводзячы і ў далейшым барацьбу за асваеньне мясцовых апалавых і сырцовых рэсурсаў, КП(б)Б павінна на XIV зьезьдзе падвесьці вынікі правядзеньня ў жыцьцё 6 умоў тав. **Сталіна** За паўгода, якія прайшлі з часу гістарычнага выступленьня тав. Сталіна на нарадзе гаспадарнікаў, па ўсіх прадпрыемствах БССР узрос процант працуючых зьдзельна, скарацілася цякучасьць, заключаюцца дагавары з калгасамі на пастаўку рабочай сілы, палепшылася абслугоўваньне культурна-бытавых патрэб рабочых, разгарнуўся шырокі рух за стварэньне гаспадарча-разрахунковых брыгад, за прымацаваньне работніка да пэўнага варштату, агрэгату, за павышэньне адказнасьці, за скарачэньне браку і г. д.

Аднак, рашучага зруху дабіліся толькі тыя прадпрыемствы, якія сапраўды па-бальшавіцку змагаліся за ажыцьцяўленьне ўказаньняў правадыра партыі і рабочай клясы—т. Сталіна. У большасьці прадпрыемстваў сустракаецца яшчэ ў роз-

ных формах рад выпадкаў і ўраўнілаўкі і абязьлічкі. Вельмі марудна адбываецца пераход ад групавой зьдзельшчыны да індывідуальнай, мае месца рад скажэньняў пры ўвядзеньні прагрэсыўнай аплаты, што прыводзіла да павышэньня зарплаты па-за ўсякай залежнасьцю ад павышэньня паказальнікаў працы. Укараненьне гаспадарчага разрахунку сустрэла апартуністычнае супраціўленьне з боку часткі гаспадарчых і прафсаюзных работнікаў.

Такім чынам, **асноўнай задачай надыходзячага XIV зьезду КП(б)Б зьявіцца мабілізацыя партыйнай арганізацыі на далейшую барацьбу за ажыцьцяўленьне 6 гістарычных указаньняў тав. Сталіна.**

Побач з выкананьнем колькасных паказальнікаў, неабходна мабілізаваць партыйныя арганізацыі на **бязумоўнае** выкананьне **якасных** паказальнікаў.

У галіне сельскай гаспадаркі асноўная ўвага КП(б)Б павінна быць сканцэнтравана **на арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў і паляпшэньні работы саўгасаў.** Гэтыя задачы можна ажыцьцявіць толькі пры ўмове правядзеньня тых-жа ўмоў, прыстасоўна да канкрэтнай абстаноўкі ў сацыялістычным сэктары сельскай гаспадаркі. Абсьледваньне 40 калгасаў, праведзенае ў пэрыяд веснавой сяўбы паказвае выкарыстаньне рабочай сілы калгасаў усяго на 57%, адыход на іншыя работы па-за калгасам складаў 8 проц. Значыцца, 35 проц. наяўных у калгасах чалавека-дзён заставаліся невыкарыстанымі. Гэтыя лічбы паказваюць, якія вялізарныя магчымасьці далейшага разьвіцьця калгаснай гаспадаркі застаюцца яшчэ нерэалізаванымі. Калі нават улічыць, што пэўная частка працоўных рэсурсаў калгасаў будзе выкарыстана больш шырока ў прамысловасьці, будаўніцтве і па іншых адыходных работах, у калгасах застаецца вельмі значны лішак рабочых рук, які дазваляе пры правільнай арганізацыі працы шпарка ісьці па шляху спэцыялізацыі і інтэнсыфікацыі калгаснай гаспадаркі.

Паказальнікі работы сьведчаць аб вялікіх зрухах у галіне сельскай гаспадаркі, значна пашырыліся пасеўныя плошчы пад ільном, якія дасягнулі ў 1931 г. 239.000 *га*, прычым удзел калгасаў у пасевах ільну выявіўся ў 51,6 проц. пры наяўнасьці 35-40 проц. ахопу калектывізацыяй вясной 1931 году. Гадавы плян камплектаваньня калгасных МТФ быў выканан на 1-я сьнежня 1931 г. у разьмеры 107.9 проц., па сьвінагадоўчых фэрмах — у разьмеры 79,7 проц. Сьвіное стада ў саўгасах вырасла са 175 тыс. штук да 200 тыс. у 1931 г. Стада рагатай жывёлы ў саўгасах вырасла з 38,7 тыс. да 75,9 тыс. штук.

Гэтыя лічбы, таксама як і хуткі рост машынізацыі сельскай гаспадаркі, сьведчаць аб тым, што спэцыялізацыя с-г БССР у кірунку разьвіцьця тэхнічных культур, малочнай жывёлагадоўлі і сьвінагадоўлі ідзе шырокімі крокамі ўперад, прычым сацыялістычны сэктар займае бясспрэчна вядучую і кіруючую ролю ў гэтых працэсах. Аднак, пры ацэнцы гэтых рэзультатаў нельга ні на хвіліну забываць таго; што яны дасягнуты ва ўмовах выключна дрэннай арганізацыі працы ў калгасах, у першы год далёка яшчэ няпоўнага правядзеньня зьдзельшчыны, пры наяўнасьці ўтрыманчых тэндэнцый, якія так ярка праявіліся, напрыклад, у саўгасах увосень мінулага году, і г. д.

Адпаведна з гэтым КП(б)Б павінна будзе выпрацаваць праграму работ надыходзячага году, якая на аснове арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў і паляпшэньня работы саўгасаў, высуне рад больш высокіх якасных патрабаваньняў.

Закранаючы пытаньні сельскай гаспадаркі, нельга не адзначыць памылак ЦК КП(б)Б, дапушчаных летам 1931 году. Гэтыя памылкі ішлі па лініі недаацэнкі задачы арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў і выяўляліся ў імкненьні скараціць тэрміны калектывізацыі БССР нават у адносінах да ўстановак, даных у вядомай пастанове ЦК УсеКП(б) ад 2 жніўня 1931 г. Пры дапамозе „Правды“, якая дала выразную палітычную ацэнку гэтым памылкам, ЦК КП(б)Б перагледзеў і выправіў свае дырэктывы і мабілізаваў партыйную арганізацыю на ажыцьцяўленьне ўказаньняў ЦК УсеКП(б)Б па калгасным будаўніцтве, ударыўшы адначасова на радзе выпадкаў пагоні за дутымі процантамі, якія мелі месца ў асобных раёнах БССР.

Дасягнутым посьпехам КП(б)Б у сацыялістычным будаўніцтве ў немалой ступені спрыяла пасьлядоўнае і правільнае ажыцьцяўленьне нацыянальнай палітыкі партыі. Пасьля XIII зьезду КП(б)Б праводзіла далей рашучую барацьбу з нацыянал-дэмакратызмам, выкрыўшы і разграміўшы контррэвалюцыйную дзейнасьць некаторых былых БНР'аўскіх міністраў. КП(б)Б ачышчала свае рады ад нацыянал-апартуністычных элемэнтаў.

Адначасова КП(б)Б шырока папулярызавала неабходнасьць рашучай барацьбы супроць ухілу ў бок вялікадзяржаўнага шавінізму, які зьяўляецца галоўнай небясьпекай на даным этапе, і нанесла рад удараў па канкрэтных носьбітах гэтага ўхілу (Вальфсон, Выдра і рад іншых).

Кастрычніцкі (1930 г.) пленум ЦК КП(б)Б указаў на неабходнасьць узмацненьня работы па беларусізацыі і паклаў пачатак добраахвотнаму руху на прадпрыемствах за вывучэньне беларускай мовы, беларускай літаратуры, гісторыі і г. д.

Рашучая барацьба ўсёй партыйнай арганізацыі на чале з ЦК КП(б)Б супроць ігнараваньня работы сярод нацыянальных меншасьцяй прывяла да прыкметнага паляпшэньня абслугоўваньня нацменшасьцяй, выправіўшы, у прыватнасьці рад грубых парушэньняў лініі партыі ў адносінах гэтай работы.

У барацьбе супроць галоўнай небясьпекі—правага апартунізму, а таксама супроць „лявацкіх“ скажэньняў, супроць прымірэнцтва і гнілога лібэралізму да трацкісцкай кантрабанды, КП(б)Б пасьлядоўна праводзіла генэральную лінію партыі, забясьпечыўшы далейшы рост ідэйнай згуртаванасьці і павышэньне клясавай пільнасьці партыйнай арганізацыі.

Ідучы далей па гэтым-жа шляху непрымірымай барацьбы за генэральную лінію партыі, не спыняючыся на дасягнутых посьпехах, па-бальшавіцку крытыкуючы асобныя памылкі і недахопы сваёй работы, КП(б)Б, апіраючыся на праробленую вялікую работу, пад кіраўніцтвам ЦК УсеКП(б) на чале з тав. Сталіным, пойдзе наперад, да новых посьпехаў і дасягненьняў.

**Гей („Правда“).**

# Шматтыражка „Чырвоны абутнік“ у барацьбе за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў

Конкурс, абвешчаны цэнтральным органам нашай партыі — „Правдой“ — зьявіўся магутным штуршком для ажыўленьня ўсёй шэфскай работы Менскай абутковай фабрыкі.

Арганізацыі фабрыкі, ударнікі, верныя закліку партыі, выступілі на дапамогу калгасам, каб перадаць ударнікам калгасных палёў свой вытворчы вопыт барацьбы за прамфінплян. Шматтыражка фабрыкі разам з шматтыражкамі іншых перадавых прадпрыемстваў і газэтай „Рабочий“ выступіла на дапамогу нізавому друку падшэфных сельсаветаў Падгайскага і Сеньніцкага. 5 брыгад шматтыражкі, якія выяжджалі для працы ў калгасы, дабіліся значных посьпехаў. Па Падгайскім сельсавеце, дзе працаваў брыгадзір шматтыражкі Чарноцкі, арганізавана 10 насьценгазэт, якія з лепшых нумароў павялі барацьбу за гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, мабілізавалі вакол сябе лепшых калгасьнікаў—ударнікаў палёў.

Прыкладам можа служыць штодзенка калгасу „БАН“, якая з 20-га лістапада выходзіць без перапынкаў. Яна дабілася зьнішчэньня раду недахопаў, зьявілася ініцыятарам датэрміновага выкананьня збожжазагатовак. Па ініцыятыве селькорак зьнят з працы падкулачнік ключнік, зьвезен з поля сельска-гаспадарчы інвэнтар, які глуміўся на полі.

Вынікам працы калгасу імя ЦК КП(б)Б, зьяўляецца поўнае выкананьне збожжазагатовак, даўшы сустрэчныя лічбы па збожжы і бульбе.

Калгас „Чырвоны май“ пры дапамозе штодзенкі займае зараз першае месца, як прыкладная гаспадарка.

Пасьля разьмеркаваньня даходаў калгасьнікі лішкі арганізавана здалі дзяржаве.

Па Сеньніцкім сельсавеце, дзе працавала брыгада тав. Квятнай (работніца фабрыкі), ахоплена працай 6 калгасаў і саўгас, дзе арганізавана 7 штодзенак. Барацьба за ўкараненьне 6-ці ўмоў тав. Сталіна—вось аснова работы новаарганізаваных штодзенак. У выніку калгас вёскі Рылаўшчыны злаў усе лішкі дзяржаве, штодзенка „Чырвонага спэцыяліста“ павяла жорсткую барацьбу з лодырамі, прагульшчыкамі. Штодзенка саўгасу імя Ўрыцкага дабілася зьнішчэньня безгаспадарчасьці ў сэнсе нагляду

Тав. Белова—ударніца, сьвінарка з калгасу „РЭС“ Стара-Дароскага раёну

за птушніцкай гаспадаркай. Зараз амаль усе штодзенкі выходзяць бесьперабойна.

Брыгады, выяжджаўшыя для працы ў падшэфныя сельсаветы, па-бальшавіцку працавалі і, пад кіраўніцтвам партарганізацыі фабрыкі, арганізавалі нараду селькораў-ударнікаў у Сеньніцкім сельсавеце, на якой прысутнічала 105 чалавек селькораў. Нарада паказала творчы энтузіязм калгасьнікаў. Завербаваны ўдарнікі друку. Яны прымаюць удзел у працы шматтыражкі, прысылаючы допісы. Брыгады рэдкалегіі зьявіліся застрэльшчыкамі сыстэматычнае працы ў падшэфных калгасах. „Вось зараз мы ведаем, хто нашы „шэфы“— гаварылі калгасьнікі. Шэфскі куст, які да гэтага часу бязьдзейнічаў, па сыгналах рабкораў узварушыўся, стаў адчуваць адказнасьць за працу. Асобныя цэхі, групы ставяць пытаньне аб дапамозе ў шэфскай працы.

Рабочыя шэфы таксама нясуць адказнасьць за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне падшэфных калгасаў, і шэфскія рабочыя брыгады павінны дапамагчы нізавому друку калгаса, забясьпечыўшы апэрацыйнасьць у рабоце калгасных газэт. Дабіцца таго, каб яны былі сапраўды баявымі дапаможнікамі партыі ў барацьбе з кулацкім і дробна-буржуазным уплывам у калгасах і саўгасах—такава задача конкурсу. Практычна дапамагчы ажыцьцяўленьню гэтага павінен наш фабрычна-заводзкі друк, маючы ўжо вялізарныя даягненьні ў барацьбе за вытворчыя пляны, за выкананьне пляна 3-га рашаючага году пяцігодкі.

**Асаёнак.**

## Расьце актыўнасьць

Добра праводзіцца работа сярод жанчын у пасёлку Дараганава (Старадароскі раён), Для працы з жанчынам-дэлегаткамі партыйная ячэйка вылучыла таварыша, які гэтай работай цікавіцца. Жанчыны ўцягнуты ў працу сельсавету, і сельсавет спраўляецца з усімі гаспадарча-палітычнымі задачамі. **У кампаніі па распаўсюджаньні пазыкі** „3-ці рашаючы год пяцігодкі“ **жанчыны гэтага сельсавету прынялі самы актыўны ўдзел.** Некалькі раз рабілі падворны абход, у выніку кантрольную лічбу па пазыцы сельсавет выканаў. 30-га лістапада 1931 году сход жанчын-дэлегатак пасёлку Дараганава вынес пастанову пашырыць тыраж раённай газэты „За калектывізацыю“. Пры сельсавеце арганізавана ўдарная брыгада па распаўсюджаньні друку, якая зрабіла падворны абход і навербавала значны лік падпісчыкаў. Дэлегацкі сход гэтага пасёлку выклікае на спаборніцтва дэлегацкі сход мястэчка Старыя дарогі на лепшае правядзеньне гаспадарча-палітычных кампаній.

Дзякуючы актыўнай працы жанчын, сэкцыі пры сельсавеце працуюць добра.

**Алесь Шпакоўскі.**

# 6 умоў т. Сталіна павінны стаць баявой праграмай працы фабрыкі „Дняпроўская мануфактура“

*(Рэйд ударніц часопісі „Работніца і калгасьніца Беларусі)*

Матальны цэх, дзе праходзіць падрыхтоўчая работа, перш чым сырэц ідзе ў ткацкі цэх, адыгрывае вялізарную ролю ў сваячасовым выпуску прадукцыі і якасьці яе. 6 умоў тав. Сталіна павінны былі легчы ў аснову ўсёй працы цэху. На жаль, мы гэтага ня бачым.

Склад рабочых матальнага цэху амаль на палову абнавіўся. Ня гледзячы на гэта, выхаваўчая і культурна-масавая работа наладжана дрэнна. Бытавыя ўмовы новых рабочых, забесьпячэньне кватэрамі, хлебам зусім не наладжана. У выніку цякучасьць рабочай сілы ў 3-м квартале дасягнула 5 проц. З 45 новых рабочых 10 пакінула працу. Прафцэхкамітэт, адміністрацыя і каапкамісія зусім слабую ўвагу зварачаюць на культурна-бытавыя ўмовы новых рабочых.

## Ураўнілаўка спрыяе цякучасьці

У цэху пануе ўраўнілаўка ў зарплаце. За сьнежань з зарплатай наступны малюнак. Старэйшы шліхтавальшчык (кваліфікаваная работа) атрымлівае 5 руб. 66 к. у дзень, а малодшы шліхтавальшчык (менш кваліфікаваная работа) атрымлівае 6 руб. 83 кап. у дзень. Снавальшчык ангельскай машыны (менш складаная) атрымлівае 4 руб. 34 к., а істужкавай (больш складаная)—2 руб. 32 кап. Такая ўраўнілаўка ў зарплаце адбівае ахвоту і зацікаўленасьць рабочага павышаць кваліфікацыю і ў значнай ступені спрыяе цякучасьці рабочай сілы. У цэху яшчэ ня ўведзена прэміяльна-прагрэсыўная аплата працы

## Тэхгурткі—на паперы

Кульгае праца па павышэньні кваліфікацыі і па аўладаньні тэхнікай. Гурткі, якія былі арганізаваны, існуюць у паветры. Ніхто іх не наведвае і ніхто імі ня кіруе. Старыя рабочыя не мабілізаваны на дапамогу новым, каб апошнія хутчэй аўладалі тэхнікай. З боку ІТР няма належнай дапамогі ў гэтай справе.

## Факты абязьлічкі

Ёсьць факты перакідваньня рабочых ад аднэй машыны да другой бяз усякіх прычын, напрыклад, рабочага Аноева. Гэта спрыяе абязьлічцы. Асабліва пануе абязьлічка сярод фабзавучнікаў. Кепскія адносіны да машын з іх боку прыводзяць да вялікай паломкі, частага рамонту і нядобраякаснай прадукцыі. У адносінах да злосных прагульшчыкаў і сы-

Тав. Гофман – старшы брыгадзір ударнай брыгады друку, член ЦК КП(б)Б.

мулянтаў ня прымаюцца рашучыя крокі як з боку цэхавай, так і агульна-фабрычнай адміністрацыі. 16 рабочых цэху прагулялі 192 гадзіны бяз уважліных прычын. У выніку—25,4 проц. прастою за сьнежань. З іх нявыхад на працу—11,84 проц., рамонт машын—1,72 проц.

## Сацыялістычныя мэтады працы не скарыстаны

З 300 рабочых у цэху сацспаборніцтвам ахоплена ўсяго 170, што сьведчыць аб кепскім яго разгортваньні. Зусім не наладжаны ўлік ударніцтва і праверка выкананьня сацдагавароў. Няма пастаяннага апэрацыйнага кіраўніцтва ходам сацспаборніцтва. Прэміяваньне лепшых ударнікаў праводзіцца зусім у нязначнай меры. Ударніцкі фонд вельмі малы і скарыстоўваецца не па прызначэньні. ЗРК ігнаруе прэміяваньне ўдарнікаў, разьмяркоўваючы дэфіцытныя тавары, валёнкі, коўдры не па прызначэньні.

## Не прапрацавана пытаньне гаспадарчага разрахунку

Ня гледзячы на пастановы бюро парткалектыву аб пераводзе ўсіх цэхаў і паасобных брыгад на гаспадарчы разрахунак, нічога практычнага ў гэтым кірунку ня зроблена. Дагавор паміж адміністрацыяй і цэхам не заключан, цэхі не прад'яўляюць адзін аднаму сацыялістычных рахункаў. Безгаспадарчасьць, недахват паасобных дэталяй перашкаджаюць пераходу на гаспадарчы разрахунак і б'юць па выкананьні прамфінпляну. Рабочыя матальнага цэху не мабілізаваны на правядзеньне гэтага важнейшага мерапрыемства, значная частка рабочых нават ня ведае сутнасьці гаспадарчага разрахунку.

## Вынаходзтва адсутнічае

На працягу 6-ці месяцаў паступіла ўсяго 6 рабочых прапаноў, з якіх ні адна да гэтага часу ня толькі не рэалізавана, але і не разгледжана. І ня дзіва, бо на фабрыцы няма „БРИЗО“ і бюро рацыяналізацыі, што вельмі дрэнна адбіваецца на праяўленьні рабочай ініцыятывы і спрыяе замарожваньню.

Матальны цэх у 1931 годзе павінен быў перапрацаваць 804 тысячы 800 кгр сырцу, перапрацавана 689.018 кгр., што складае 85,6 проц. выкананьня прамфінпляну.

85,6 проц. выкананьня прамфінпляну зусім мала і не адпавядае сучасным тэмпам сацыялістычнага будаўніцтва. Неабходна з коранем вырваць усе недахопы, якія перашкаджаюць пасьпяховаму выкананьню прамфінпляну. Толькі поўная рэалізацыя 6-ці сталінскіх умоў, ліквідацыя абязьлічкі і ўраўнілаўкі, перавод цэхаў і брыгад на гаспадарчы разрахунак, шырокае разгортваньне сацспаборніцтва і ўдарніцтва, сыстэматычная праца па аўладаньні тэхнікай, наладжаньне культурна-масавай працы і паляпшэньне бытавых умоў рабочых—забясьпечаць поўнае выкананьне прамфінпляну 1932 году.

Брыгада часопісі „Работніца і калгасьніца Беларусі“: **Гофман Хана, Фрумкіна Рахіль, Гіськіна, Земляная, Алёнкіна, Неўзьліна, Зялінэр Фаня, Чайкова, Дагман Блюма, Дранкіна, Лібэнзон, Руўзіна, Ісаенка, Каган, Піліпенка, Гутараў, Новікаў, Лібэнзон, Какоўка, Вінд Р., Аноеў, Годздзанкер.**

# За лепшую якасьць работы гаспадарча-разрахунковых брыгад

*„Пусьціць у справу новыя крыніцы накапленьня, ліквідаваць безгаспадарчасьць, укараніць гаспадарчы разрахунак, зьнізіць сабекошт і ўзьняць унутрыпрамысловыя накапленьні“ (Сталін).*

Ударнікі БССР з вялізарным энтузіязмам падхапілі ініцыятыву перадавых рабочых Ленінграду, якія высунулі новую, **вышэйшую, найбольш канкрэтную форму разьвіцьця ленінскай ідэі сацспаборніцтва і ўдарніцтва—гаспадарча-разрахунковую брыгаду.**

Ня гледзячы на тое, што пры першым этапе разьвіцьця гаспадарча-разрахунковых брыгад ініцыятыва рабочых ня была сваячасова ўзначалена прафэсыянальнымі і гаспадарчымі арганізацыямі, у сучасны момант па БССР ужо налічваецца каля тысячы гаспадарча-разрахунковых брыгад, якія змагаюцца за лепшыя формы сацыялістычнай працы, за правядзеньне ў жыцьцё 6-ці ўмоў правадыра камуністычнай партыі тав. Сталіна.

Многія гаспадарча-разрахунковыя брыгады, якія толькі нядаўна арганізаваны, паказваюць ужо сапраўдныя бальшавіцкія ўзоры працы.

Брыгада шышэльніц („Чырвоны мэталіст“ у Віцебску), якая раней зьяўлялася вузкім месцам на заводзе, пасьля пераходу на гаспадарчы разрахунак значна **ўзьняла прадукцыйнасьць працы** пры адначасовым скарачэньні складу брыгады з 21 да 16 асоб.

На грабарні „Бальшавік“ (у Менску) брыгада набіўшчыкаў 2-га хромавага цэху дала за верасень эканоміі 1.805 руб. (павялічэньне плошчы скур), за кастрычнік—4210 руб. пры выкананьні пляну па колькасных паказальніках на 127,2 проц.

Тав. Крывіцкая—ударніца гаспадарча-разрахунковай брыгады грунтаўшчыц заводу Дрэваапрацоўшчык.

На панчошнай фабрыцы „Клара Цэткін“ (Віцебск) **брыгада на гаспадарчым разрахунку ў вязальным цэху дае 500 руб. эканоміі ігалак у месяц.** Замест 100 паводле пляну і 80 паводле сустрэчнага, фактычна выдаткоўваецца толькі 50; **замест дзеннай выпрацоўкі ў 230 дзесяткаў панчох брыгада дала сустрэчны да 235 дзесяткаў. За час працы брыгада ня мела ніводнага прагулу і спазьненьня.** У брыгадзе па кравецка-цыравальным цэху замест 50 проц. браку па пляне процант браку даведзен да 0,5—0,8 проц. Угар па мательным цэху даведзен з 1 проц. да 0,7 проц.

Брыгада кэтлеўшчыц выканала плян на 106,2 %. У вязальным цэху арганізавана плянава-апэрацыйная група, куды ўвайшлі брыгадзіры гаспадарча-разрахунковых брыгад. Узор працы дае і брыгада моладзі на фабрыцы „Прафінтэрн“ (Віцебск). Яна за 10 дзён лістапада плян выканала на 106 проц, Брыгада ня мела браку і пераробак. Ёсьць значная эканомія ў гарнітуры (на 700 мэтраў кромкі, па нітках і інш.).

Такіх прыкладаў можна прывесьці многа, але ўжо і прыведзеныя факты выразна сьведчаць аб вялізарным значэньні разьвіцьця гаспадарча-разрахунковых брыгад, аб дасягненьнях у іх рабоце. Гаспадарчы разрахунак брыгад спрыяў укараненьню яго ў ліцейным цэху (на „Чырвоным мэталісьце“), які зараз атрымаў пераходны чырвоны сьцяг.

У першым пэрыядзе арганізацыі брыгад мы мелі яўнае і скрытае супраціўленьне з боку паасобных гаспадарнікаў і прафработнікаў. Некаторыя блыталіся ў неразуменьні розьніцы паміж гаспадарчым разрахункам у цэху (адміністрацыйная адзінка) і гаспадарчым разрахункам брыгады, якая зьяўляецца аднэй з вышэйшых форм сацспаборніцтва і ўдарніцтва на аснове росту матар'яльнай зацікаўленасьці рабочых у павышэньні прадукцыйнасьці працы, у паляпшэньні якасьці, у зьніжэньні сабекошту. Былі выпадкі насаджэньня гаспадарча-разрахунковых брыгад зьверху „па загаду“, устанаўленьня матар'яльнай адказнасьці брыгад і рад іншых скажэньняў. Адзін старшыня цэхкамітэту (ф-ка імя Лекерта ў Віцебску) заявіў, што немагчыма пераводзіць брыгады на гаспадарчы разрахунак па прычыне таго, што прадпрыемства ня выконвае прамфінпляну. Гэты „гора - прафработнік“ не зразумеў, што **гаспадарча-разрахунковая брыгада зьяўляецца магутным фактарам у справе забесьпячэньня выкананьня прамфінпляну.**

Для правільнай работы брыгады самая сур'ёзная ўвага павінна быць зьвернута на тое, каб унутраная яе пабудова адпавядала задачам вытворчасьці, тэхналёгічным працэсам.

Гаспадарча-разрахунковая брыгада павінна будавацца пры выразна вызначаным вытворчым участку з адноль кавымі паказальнікамі. Але часамі гэтаму не аддаецца належнай увагі. Ёсьць яшчэ выпадкі, што прэмія выплачваецца ўсім удзельнікам брыгады бяз уліку працы кожнага (фабрыка імя Клары Цэткін і інш.).

Ёсьць і такія скажэньні, што старэйшаму брыгадзіру выплачваецца дадатковая зарплата за лік брыгады ў той час, калі пастанова ЎсеЦСПС і ВСНГ СССР ад 11-IX зусім ясна паказвае, што старэйшы брыгадзір ад працы не вызваляецца і дадаткова да свайго заработку атрымлівае ад адміністрацыі прыкладна 25 проц.

Асабліва дрэнна з пытаньнем уліку работы і эфэктыўнасьці работы брыгад. Цэнтральная задача партыйных, прафэсыянальных і гаспадарчых арганізацый узмацніць кіраўніцтва і дапамогу ў штодзеннай працы брыгад, зрабіць поўны паварот „тварам да гаспадарча-разрахунковай брыгады“, разгарнуць сацспаборніцтва паміж удзельнікамі ў самой брыгадзе і паміж паасобнымі брыгадамі, укараніць зьменна-сустрэчнае пляванаваньне ў брыгадах, уцягнуць найбольшую колькасьць работніц у брыгады і гэтым забясьпечыць пасьпяховае выкананьне прамфінпляну 4-га заключнага году пяцігодкі.

І.

# ШЭН-ХЭЙ КАМУНІСТКА

Агнэса Сьмідлі

*(Працяг)*

У Кітаі вельмі цяжка ўтаіць што-небудзь, весткі перадаюцца нібы ветрам. Гэтым, трэба лічыць, тлумачыцца тая акалічнасьць, што ў хуткім часе з Ву-Чангу прыбылі два студэнты і адна студэнтка, і ім удалося, падкупіўшы вартаўніка, перадаць вестку аб сабе Шэн Вэй. А неяк увечары Шэн-Вэй. невядома якім чынам, ускарабкалася на высокую сьцяну і заразжа растала ў цемры па другі яе бок. Тэй-жа ноччу яна разам з таварышамі накіроўвалася ўжо ў Ву-Чанг пры мільгаценьні зорак.

Гэта здарылася ў канцы лета 1926 году, калі ветры рэвалюцыі бушавалі ў Кітаі. У хуткім часе паўднёвыя арміі абступілі Ву-Чанг. І тады Шэн-Вэй кінула вучыцца і далучылася да мас. Яна стала членам саюзу камуністычнай моладзі, пазнаёмілася з адным папулярным у масах правадыром сялян-паўстанцаў і пакахала яго. Ганьбуючы старыя звычаі, на падставе якіх яна ўсё яшчэ заставалася жонкаю сына памешчыка, яна абвясьціла сябе ў вольным шлюбе з любым чалавекам.

Шэн-Вэй зажыла жыцьцём бяднейшай батрачкі, апраналася, як усе сялянкі, ела тое-ж самае, што і яны, працавала, як і яны, і разам з імі ня раз пазірала сьмерці ў вочы ва многіх баёх. Яшчэ тады, калі Шэн-Вэй выношвала пад сэрцам свайго пярвыша, яна з усёй уласьцівай ёй энэргіяй аддалася рэвалюцыі, а калі нарадзілася дзіця, яна прыладзіла яго, як гэта заведзена ў Кітаі, за сьпіною і ня спыняла сваёй справы.

У тыя дні Гаміндан і камуністычная партыя працавалі яшчэ плячо ў плячо. І Шэн Вэй, як адна з найбольш актыўных рэвалюцыянэрак, была камандыравана на сваю бацькаўшчыну ў якасьці загадчыцы жанаддзелам Гаміндану. Там яна была выбрана членам рэўтрыбуналу, які судзіў ворагаў рэвалюцыі, канфіскаваў зямлю памешчыкаў і разьмяркоўваў яе пэміж беднымі сялянамі. Шэн-Вэй прымала ўдзел у канфіскацыі зямлі сваёй уласнай сям'і і свайго былога жаніха.

Калі рэвалюцыя ператварылася ў рэвалюцыю сацыяльную, паміж Гаміданам і камуністамі адбыўся раскол. Тады пачаўся жудасны белы тэрор, каштаваўшы жыцьця дзесяткам тысяч паўстаўшых сялян і рабочых. Мілітарысты і памешчыкі-фэадалы зноў узялі ўладу. Сям'я Шэн-Вэй і сям'я яе былога жаніха зьвярнуліся да Гаміндану з патрабаваньнем, каб яе арыштавалі. Патрабаваньне гэта было задаволена: быў выдан ордэр на арышт. Гэта было роўназначна сьмяротнаму прысуду для Шэн-Вэй і для яе дзіцяці. Дзьве жанчыны і тры мужчыны, што працавалі разам з ёю, былі схвачаны. Жанчынам адрэзалі грудзі, а потым усім пецярым былі адсечаны галовы на адным з пляцоў. Рабочыя падрыхтавалі труну, прасьвідравалі ў ёй дзіркі,, палажылі ў яе Шэн-Вэй з яе дзіцем і пранесьлі яе праз вароты, якія пільна ахоўваліся, на могілкі, што знаходзіліся за горадам.

З таго дня пачалося вандраваньне Шэн-Вэй у Ву-Чанг. Аднаго разу яна была затрымана, бо яе кароткa падстрыжаныя валасы выдавалі ў ёй рэвалюцыянэрку. Але Шэн-Вэй з з дзіцем на руках так спрытна разыграла „сьвятую нявіннасьць", што яе адпусьцілі.

Але толькі Шэн-Вэй дабралася да гарадоў правінцыі Ухан, як камуністычная партыя загадала ёй накіравацца ў самую гушчу бою—Заходні Хунань, дзе сяляне ўзброіліся, адмовіліся плаціць падаткі і пачалі захватваць памешчыцкія землі. Шэн-Вэй была з паўстанцамі ў гэтыя дні. Ночы яна праводзіла ў лесе, акружаная людзьмі, якія трывожна кідаліся ў сьне, падобна да яе, баяліся заставацца ўночы дома.

А потым супроць іх было выслана войска. Сяляне панесьлі паражэньне, тысячы былі зьнішчаны, іншыя ўсе раззброены. Шэн-Вэй зноў вярнулася ва Ўхан. І зноў партыя камандыравала яе на работу ў самую гушчу баёў. Але на гэты раз яна накіравалася нібы член Гаміндану ў горад, заняты мілітарыстамі. За сьценамі гораду разьмясьціліся арміі пастаўшых сялян. Шэн-Вэй, знаходзячыся ў межах гарадзкіх сьцен адкрыта выступала, як загадчыца жанаддзелу Гаміндану, а цішком вяла прапаганду сярод салдат і рабочых.

У гэтым-жа горадзе яна пазнаёмілася з чыноўнікам, які стаяў на чале законадаўчай палаты, і той закахаўся ў яе. Ён належаў да ліку багатыроў-мілітарыстаў, але Шэн-Вэй тым ня менш уважліва выслухоўвала яго прызнаньні, а адначасова выведвала ў яго пляны, якія будаваліся з мэтай разгрому сялян-паўстанцаў. Усё, пра што яна ад яго даведвалася зараз-жа яна перадавала сялянскай арміі за сьценамі гораду. А там адным з правадыроў быў яе ўласны муж.

Нарэшце, паўстанцы павялі атаку на горад. А Шэн-Вэй так адкрыта пачала прапагандаваць сярод салдат, што яе арыштавалі і пасадзілі ў турму. Яна была прысуджана на сьмерць. Ёй удалося паведаміць закаханаму ў яе буйному чыноўніку, і той, выслухаўшы яе запэўненьні ў поўнай невінаватасьці, паверыў ёй, дабіўся яе вызваленьня і дапамог ёй выйсьці з гораду.

Але сяляне былі разьбіты. Сярод тых, каму ўдалося выратавацца, быў і муж Шэн-Вэй, які знайшоў яе, нарэшце, ва Ўхане, Шэн-Вэй была даручана тэхнічная работа ў партыі—набор і друкаваньне прапаганды. Яна клала дзіця на стол каля сябе і, сьпяваючы яму ціхенька, рабіла сваю работу. Аднаго разу

# Ударніцы збожжазагатовак

## Ударніцы—ініцыятары чырвонага абозу

**Па ініцыятыве лепшых ударніц, калгасьніцы „Чырвонага сьцягу", Гаўрыленскага сельсавету, Касьцюковіцкага раёну, арганізавалі чырвоны абоз ільну (15 цэнтнэраў) у падарунак 13 райпартканфэрэнцыі.** Ударніцы гэтага калгасу прэміяваны па 10 мэграў мануфактуры кожная. **Матрасава.**

## Узяць прыклад

Калгас „Чырвоны франтавік" Крываноўсаўскага сельсавету Стара-Дароскага раёну сваячасова выконвае заданьні па розным відам загатовак. Так плян здачы бульбы выкананы поўнасьцю. Здадзена 41 тонна. Калгас высунуў сустрэчны плян і абавязуецца здаць яшчэ 82 тоны. Па мясазагатоўкам калгас значна перавыканаў заданьні. Па пляну мелася здаць 25 штук, а здадзена 33 галавы жывёлы.

Іншыя віды загатовак калгас абавязуецца выканаць поўнасьцю.

**Алесь Лубін.**

## Адна з лепшых змагароў за збожжазагатоўкі

Гадавы плян збожжазагатовак па Асінаўскім сельсавеце, Чавускага раёну, на 10 студзеня 1932 году выканан на 76 проц. **Калгасны сэктар па сельсавеце выканаў—на 107 проц,** асабліва калгасьнікі „Чырвонай зоркі" (вёска Слабодка) **на чале з членам сельсавету Малінскай Адаркай,** якая сапраўды паказала ўзоры барацьбы за збожжазагатоўкі.

**Малінская прэміявана 3 разы сельсаветам і сельспажыўтаварыствам за ўдарную работу ня толькі ў калгасе, але і грамадзкай рабоце.**

Усе члены сельсаветаў Чавускага раёну і ўсёй БССР павінны пасьледаваць прыкладу **Малінскай.** **М. А. Захарэнак.**

## Да адказнасьці праўленьне, якое зрывае апрацоўку і здачу ільну

Ня гледзячы на пастановы партыі і ўраду аб важнасьці найхутчэйшай апрацоўкі ільну і здачы (продажу) яго дзяржаве, Старасельскі калгас „Бальшавік" (Талачынскі раён) да апрацоўкі ільну яшчэ не прыступіў.

Месячнік апрацоўкі ільну і здачы яго дзяржаве ў калгасе „Бальшавік" зусім не адчуваўся. На запытаньне селькорак—чаму не апрацоўваецца лён—старшыня калгасу адказвае: „Што ж, усяго разам ня зробіш".

Тэрміновая апрацоўка ільну і здача яго дзяржаве—адна з галоўнейшых нашых задач. „Бальшавік" павінен зараз жа мабілізаваць усе сілы на хутчэйшую апрацоўку ільну для таго, каб хутчэй здаць яго дзяржаве.

**Селькорка.**

## Ударыць па апартуністычным нормам агранома Казыронка

Калгас „Сьветлы прамень, Баеўскага сельсавету (Дуброўна) засеяў 55 гект. ільном. Лён увесь быў убраны і добра захаваны. Загатоўчы плян калгасу складаецца з 88 цэнтнэраў ільнавалакна і 20 тон трасты і на 3 XII 31 г. выканана толькі 25 цэнтнэраў.

Па апрацоўцы ільну ў калгасе створаны брыгады па трапаньні, была ўстаноўлена норма трапаць 20 фунтаў. Але „знаўца" справы аграном райкалгассаю у Казыронак зьнізіў гэтыя нормы да 16 фунтаў, лічачы 20 фунтаў вялікай нормай.

Ударніцы гэтага калгасу выправілі памылку агранома. Яны выпрацоўвалі па 25—27 і 30 ф. пры норме ў 16 ф. Аграном Казыронак павінен ведаць, што пры ўстаноўцы норм трэба раўняцца па лепшых ударніках. **К.**

---

на яе дом была зроблена аблава. Муж Шэн-Вэй кудысьці вышаў, а яна сама толькі адлучылася на некалькі хвілін. Шэн-Вэй здалёк пасьпела заўважыць, што дом абступлен салдатамі. Калі яна праз некалькі гадзін потым прабралася, нарэшце, да сябе, яна знайшла, што салдаты кінулі яе дзіця ў вядро з вадой, і ніякія кволыя ласкі Шэн-Вэй і яе мужа не маглі вярнуць жыцьця дзіцяці.

Муж Шэн-Вэй пацалункамі асушыў горкія сьлёзы Шэн-Вэй, і маладая жанчына вярнулася да сваёй работы.

Дзіўныя рэчы здараюцца на сьвеце. І вось што здарылася аднаго разу з Шэн-Вэй.

Яна неяк пашла наведаць начальніцу школы, у якое калісьці вучылася, і парашыла застацца ў яе пераначаваць. Сонца ледзь пырснула праменьнямі, як раптам Шэн-Вэй была разбуджана шумнымі галасамі. Ёй нават здалося, што яна чуе голас мужа. Шэн-Вэй прысела на ложку і да яе

## ШЭН-ВЭЙ КАМУНІСТКА

*(Працяг)*

вушэй дайшлі воклічы: „Мы паміраем у імя камунізму! Няхай жыве рэвалюцыяі" Хутка пачулася некалькі залпаў і крыкі змоўклі.

Шэн-Вэй устала, вышла з дому і вобмацкам накіравалась да

пляцу. Салдаты ўжо адыходзілі, і толькі невялікая кучка цікаўных у зьдзіўленьні пазірала на доўгі рад трупаў, што валяліся на зямлі. Шэн-Вэй абышла ўсе трупы і, нарэшце, перавярнула адзін з іх. Гэта было яшчэ неастылае цел яе мужа.

Улетку 1929 году Шэн-Вэй ужо зноў змагалася ў радох пастаўшых сялян Хунаня. А нойчы яе паслалі ў Чан-Ша, і там яна была захвачана ў палон разам з двума другімі камуністамі.

6 месяцаў прабыла Шэн-Вэй у турме.

Яна вышла з турмы з нейкай наскурнай хваробай, з растройствам страўніка і са злаякасным нарывам. У такім стане вярнулася яна зноў да паўстаўшых сялян і зноў узялася за работу.

Знойдуцца людзі, якія запытаюць: „А што, Шэн-Вэй маладая і прыгожая?"

Шэн-Вэй адбылося 25 год. Скура ў яе даволі цьмяная, твар—шырокі, скулы—выдаюцца. Вочы Шэн-Вэй чорныя, як ноч, але яны гараць і, здаецца, бачаць скрозь цемру, чарней тэй, якая ў поўнач ахінае Кітай.

Ці прыгожая Шэн-Вэй? Праўду кажучы, ня ведаю. А зямля прыгожая?

**Канец.**

*Пераклад з англійскай мовы.*

ГПБ Ср.-Ав.

# РОЛЯ ЖАНОЧЫХ ВЫТВОРЧЫХ НАРАД КАЛГАСЬНІЦ У ЧАСЕ

XVI зьезд УсеКП(б) падкрэсьліў, што „неабходнае для дасягненьня вышэйшай прадукцыйнасьці працы стварэньне ў калгасах новай грамадзкай дысцыпліны можа быць дасягнута толькі на аснове сапраўднай самадзейнасьці і актыўнага ўдзелу калгасьнікаў і калгасьніц у кіраўніцтве гаспадаркай калгасу". Усе члены калгасу павінны быць прыцягнуты ў тэй ці іншай форме да работы па кіраваньні жыцьцём калгасу.

Асноўная форма такога прыцягненьня ёсьць **вытворчыя нарады, якія зьяўляюцца моцным сродкам, спрыяючым разгортваньню творчай ініцыятывы мас.**

Апрача абавязковага і шырокага ўцягненьня жанчын-калгасьніц у работу агульна-калгасных вытворчых нарад **неабходна арганізаваць спэцыяльныя жаночыя вытворчыя нарады калгасьніц у тых галінах прады, дзе пераважна працуюць жанчыны.**

Жаночыя вытворчыя нарады павінны паставіць сваёй мэтай разьвіцьцё ініцыятывы калгасьніц у вырашэньні задач арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў, уздыму ўраджайнасьці, павышэньня якасных паказальнікаў сацыялістычнай жывёлагадоўлі, разьвіцьця высокай таварнасьці гаспадаркі, правільнай арганізацыі жаночай працы, падняцьця яе прадукцыйнасьці і лепшага скарыстаньня вопыту перадавых калгасьніц-ударніц, паляпшаньня ўмоў працы і быту калгасьніц (арганізацыя ясьляй, сталовак, пральняў і г. д.), павышэньня кваліфікацыі калгасьніц, абгаварэньня кандыдатур на вылучэньне.

Ва ўсіх буйных калгасах, у якіх ёсьць таварныя фэрмы (малочныя, садова-гародныя, сьвінагадоўчыя, птушніцкія і трусагадоўчыя) і ільнаводчыя калгасы **павінны арганізоўваць па брыгадна-вытворчым прынцыпе галінныя жаночыя вытворчыя нарады.**

У склад жаночых вытворчых нарад уваходзяць загадчыкі адпаведных галін гаспадаркі калгасу, брыгадзіршы, групаводы і ўсе калгасьніцы, якія выконваюць адказную працу ў адпаведнай галіне. Да работы ў вытворчай нарадзе прыцягваецца ўвесь жаночы актыў калгасу (ударніцы, дэлегаткі і і г. д.) і абавязкова адпаведныя спэцыялісты, якія працуюць у гэтай галіне.

Калгасы павінны ўжо зараз разгарнуць шырокую падрыхтоўчую працу з тым, каб забясьпечыць баявую сустрэчу трэцяй бальшавіцкай вясны.

Важнейшымі момантамі веснавой пасеўнай кампаніі 1932 году зьяўляюцца мерапрыемствы **на далейшым разьвіцьці тэхнічных культур і сацыялістычнай жывёлагадоўлі, узмацненьне ролі плодагародных гаспадарак, пашырэньне пасеўнай плошчы яравога кліну на 12 проц., траў і тэхкультур—на 15 проц., бульбы—на 20 проц. і рост прадукцыйнасьці жывёлагадоўлі — на 20 проц.**

Цэнтральнай задачай веснавой пасеўнай кампаніі павінна быць арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, арганізацыя працы ў калгасах на аснове ажыцьцяўленьня сапраўднай зьдзельшчыны, правільны ўлік, ліквідацыя ўраўнілаўкі і абязьлічкі, укараненьне агратэхнікі, ажыцьцяўленьне шасьці ўмоў т. Сталіна ў калгасах.

Роля жаночых вытворчых нарад у калгасах па падрыхтоўцы і правядзеньні трэцяй бальшавіцкай веснавой пасеўнай кампаніі надзвычай вялікая.

**Жаночая вытворчая нарада павінна мабілізаваць увесь актыў жанчын калгасьніц, прынясьці самы шырокі ўдзел у складаньні і прапрацоўцы рабочага пляну веснавой сяўбы ў калгасе.**

**Задача разьвіцьця тэхнічных культур—ільну і канапель—у 1932 годзе ставіцца, як адна з баявых задач партыі.** Жаночая вытворчая нарада павінна абгаварыць і намеціць рад канкрэтных мерапрыемстваў па падрыхтоўцы да веснавой сяўбы і далейшым доглядзе ільну і канапель з тым, каб забясьпечыць якасныя паказальнікі па вырошчваньні (сваячасовая праполка і г. д.), уборцы і апрацоўцы тэхкультур, як вядучай паляводчай культуры рэспублікі.

**„Праблема разьвіцьця сацыялістычнай жывёлагадоўлі, асабліва сьвінагадоўлі зьяўляецца актуальнай для БССР, як аднаго з важнейшых жывёлагадоўчых раёнаў Савецкага Саюзу"** (з пастановы аб'яднанага лістападаускага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б). Дакладнае правядзеньне ў жыцьцё ўсіх мерапрыемстваў па разьвіцьці сацыялістычнай жывёлагадоўлі зьяўляецца абавязковым і неадкладным для ўсіх калгасаў і ў часе веснавой пасеўнай кампаніі.

У задачу жаночых вытворчых нарад калгасьніц пры гэтым уваходзіць надзвычай адказная работа па абгаварэньні і паляпшэньні практычных мерапрыемстваў па павялічэньні прадукцыйнасьці і таварнасьці жывёлагадоўлі. Павышэньне ўдою кароў і выхаду таварных падсьвінкаў на 20 проц.—вось баявое заданьне партыі і ўраду, у выкананьні якога павінны аказаць значную дапамогу жаночыя вытворчыя нарады. Распрацаваць абавязкі працуючых на скотным дварэ і сьвінарніку, удасканаліць ім нормы выпрацоўкі з пераходам на прагрэсыўна-прэміяльную зьдзельшчыну, ліквідаваць абязьлічку ўраўнілаўку, арганізаваць сацспаборніцтва і ўдарніцтва сярод даярак, сьвінарак і іншых калгасьніц, што працуюць па жывёлагадоўлі,—усімі гэтымі пытаньнямі павінны неадкладна заняцца жаночыя вытворчыя нарады.

Улік малака на маслазаводзе г. Гародзішча

**ЦК КП(б)Б і СНК БССР пастанавілі „фарсаваць у 1932 годзе якасныя паказальнікі ў плодагародніх гаспадарках, вызначыўшы заданьне пад гародамі ў 70.000 га, ягаднікам — 5.000 га, новымі садамі— 13.000 га.**

Жаночыя вытворчыя на-

# ...ц У ЧАСЕ ПАДРЫХТОЎКІ ДА ВЕСНАВОЙ ПАСЕЎНАЙ КАМПАНІІ

...ельшчыны, ...лічкі, ука... ...моў т. Ста...

...па падрых... ...веснавой

...абілізаваць ...мы шырокі ...пляну вес...

...ну і кана... ...вых задач ...абгаварыць ...па падрых... ...ядзе ільну ...аказальнікі ...), уборцы ...й культуры

...ёлагадоўлі, ... для БССР, ...наў Савец... ...падаўскага ...равядзеньне ...ці сацыялі... ...ым і неад... ...й пасеўнай

...асьніц пры ...па абгава... ...емстваў па ... жывёлага... ...рных пад... ...тыі і ўраду, ... дапамогу

рады ў калгасах, асабліва прыгараднай зоны павінны знамеціць рад мерапрыемстваў, як абавязковы мінімум, па наглядзе за гароднінай (поліва, матыкаваньне і г. д.) з тым, каб забясьпечыць максымальны ўраджай гародніны і інш. культур.

Рашаючую ролю адыграюць жаночыя вытворчыя нарады калгасьніц у справе правільнай расстаноўкі і максымальным выкарыстаньні жаночай рабочай сілы ў калгасах у часе веснавой пасеўнай кампаніі з тым, каб максымальна вызваліць мужчынскую рабочую сілу для прамысловасьці (у адыход).

Жаночыя вытворчыя нарады калгасьніц павінны рашуча змагацца з наскрозь гнілой, апартуністычнай думкай, якая існуе ў праўленьнях некаторых калгасаў, што ў калгасах нібы ня толькі няма лішкаў, а нават не хапае рабочых рук для сваіх уласных унутрыкалгасных патрэб.

Па матар'ялах досьледаў 40 калгасаў, праведзеных у часе веснавой сяўбы 1931 году, відаць, што скарыстаньне рабочай сілы калгасамі было ўсяго на 57 проц., а адыход на іншыя работы складаў толькі 8 проц. Такім чынам, 35 проц. чалавекадзён у калгасах заставаліся невыкарыстанымі. Жаночая праца ў калгасах дагэтуль выкарыстоўваецца ў яшчэ меншай ступені (25—30 проц.).

Пры складаньні вытворча-фінансавых плянаў на 1932 год і плянаў веснавой пасеўнай кампаніі неабходна ўлічыць гэтыя моманты і расставіць сілы ў калгасах так, каб больш уцягнуць жанчын у калгасную вытворчасьць.

Неабходна вызваліць жанчын-калгасьніц ад кухні, пялёнак і інш. хатніх клопатаў. Трэба пашырыць і палепшыць культурна-бытавое абслугоўваньне калгасаў. Гаспадарчыя арганізацыі, якія зацікаўлены ў прыцягненьні калгаснай працы (Лесбел і інш. трэсты), павінны аказаць калгасам максымальную дапамогу ў гэтых адносінах. Па матар'ялах рапартоў-справаздач ад 5.585 калгасаў (на 1-VI 31 году) відаць, што культбытавое абслугоўваньне калгасаў у часе веснавой сяўбы 1931 году было слабое. Так, калгасаў, якія маюць дзіцячыя сады і пляцоўкі разам, было толькі 340. У 1.014 калгасах былі толькі дзіцячыя ясьлі, якімі было ахоплена 28.376 дзяцей.

...аслазаводзе „Гародзішча" Ленінградскай вобласьці.

Грамадзкае харчаваньне ў полі, у часе веснавой сяўбы было арганізавана толькі ў 212 калгасах. Калгасаў з агульнай сталоўкай налічвалася толькі 277. Клюбаў у калгасах—379, хатчыталень — 376, чырвоных куткоў—1.242, толькі 1.487 калгасаў мелі насьценныя газэты.

Бязумоўна, усе гэтыя абставіны надзвычай уплывалі на тое, што жанчыны-калгасьніцы вусім слабы ўдзел прымалі ў калгаснай працы.

Неабходна, каб у часе падрыхтоўкі да веснавой пасеўнай кампаніі гэтага году ўсе гэтыя недахопы былі ўлічаны, каб жанчына-калгасьніца зрабілася сапраўдным удзельнікам арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў.

Праводзячы шырокую работу па поўным уцягненьні жанчын-калгасьніц у калгасную працу, усямерна паляпшаючы арганізацыю жаночай працы праз сапраўднае ўкараненьне зьдзельшчыны, ліквідацыю абязьлічкі і ўраўнілаўкі, а таксама разгортваючы шырокае прыстасаваньне сацыялістычных мэтадаў—**сацспаборніцтва і ўдарніцтва ў штодзеннай працы жанчын-калгасьніц**,—жаночыя вытворчыя нарады ў калгасах на практыцы рэалізуюць 6 гістарычных умоў тав. Сталіна, дапамогуць найхутчэйшаму арганізацыйна-гаспадарчаму ўмацаваньню калгасаў у часе веснавой пасеўнай кампаніі чацьвертага, заключнага году пяцігодкі.

**С. Кудзінаў.**

## Вучэцеся ў Васілевіч

Ударніца-селькорка **Васілевіч** з Засьценкаўскага калгасу, Баеўскага сельсавету, па-бальшавіцку змагаецца за лён. Бачачы прарыў ва ўборцы і апрацоўцы ільну ў калгасе, тав. Васілевіч арганізавала брыгаду з 20 жанчын, з іх 11 калгасьніц, 9 аднаасобніц, якія актыўна працавалі і дапамаглі калгасу.

Гэта брыгада працавала нават у сьвята, паказваючы прыклад іншым жанчынам. Бярэце прыклад з селькоркі тав. Васілевіч.

**К.**

## Як мы падцягнулі адсталых

Стайчэўскае аддзяленьне калгасу імя Сталіна, Замоскага сельсавету, дзякуючы ўжыванню сацыялістычных мэтадаў працы—ударніцтва і сацспаборніцтва, скончылі апрацоўку ільну да 20-XII. Праца па апрацоўцы пераведзена на зьдзельшчыну.

Скончыўшы апрацоўку, брыгады склікалі сход і абгаварылі працу кожнай брыгады і ў пасобку кожнага ўдзельніка брыгады. Адзначылі, хто добра працаваў, а хто дрэнна. Зроблена гэта з мэтай, каб надалей усе стараліся і працавалі добра. Зараз ёсьць вынікі—хто працаваў на сене кепска, на малацьбе працуе лепш.

**Праходжы.**

## 4 месяцы „афармляюць" прыём

Калгасьніца калгасу „Новы селянін", Старадароскага раёну, Мельнік Алена па ўдарнаму працуе ў калгасе. Яна падала заяву ў камсамол, ячэйка ЛКСМБ прыняла яе, але ўжо 4 месяцы ляжыць анкета Мельнік Алены ў Старадароскім РК ЛКСМ. Прыём да гэтага часу не аформлен.

Разам з анкетаю Мельнік Алены 3—4 месяцы ляжаць у РК яшчэ 7 анкет з Залускай ячэйкі ЛКСМ. Хоціць марынаваць анкеты, тармазіць рост камсамолу за кошт лепшых ударніц-калгасьніц.

**М. Ш—оў.**

СНБ Ср.-Аз.

# Фабрыка „Спартак“ павінна працаваць бесьперабойна

*(Рэйд шклоўскіх ударнікаў друку на ф-цы „Спартак“)*

Фабрыка „Спартак“ (Шклоў) мае ўсе пэрспэктывы ня толькі для выкананьня, але і перавыкананьня прамфінпляну, бо яна забясьпечана сырцом, апалам, адміністрацыйна-тэхнічным пэрсаналам. Між іншым прамфінпляна з кварталу ў квартал недавыконваецца. За 3-ці квартал—74 проц.; лістапад—62 проц., першая дэкада сьнежня — 50 і другая дэкада—59. Чаму-ж атрымліваюцца такія прарывы?

### Гаспадарчы разрахунак адсутнічае

Гаспадарчы разрахунак, як вагар выкананьня прамфінпляну па колькасных і якасных паказальніках на фабрыцы „Спартак“ праведзен фармальна. Адміністрацыйна-тэхнічны пэрсанал фабрыкі, партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі не зрабілі належнага пералому па яго ўкараненьні ў цэхах і брыгадах. На гаспадарчы разрахунак праведзены тры брыгады, але дагавары з адміністрацыяй не заключаны, уліку працы не вядзецца, кіраўніцтва ніякага няма. Брыгада Бернатовіча прапанавала—з мэтай эканоміі сродкаў і рабочай сілы звольніць прыбіральшчыцу ля машыны, узяўшы гэту працу на сябе. Але адміністрацыя не зьвярнула на гэта ўвагі. Загадчыкі цэхаў не прытрымліваюцца кантрольных лічбаў выдаткаў цэху, у выніку — пераўвялічаны штат цэхаў (мэханічны, папяровы), тэхнічны кантроль адсутнічае.

Прэміяльна-прагрэсыўная зьдзельшчына на фабрыцы толькі прапрацоўваецца і тэхнічна не афармлена.

### Дабіць абязьлічку

За якасьць рамонту ніхто не адказвае, што спрыяе частым прастоям. Абязьлічана праца кляйной. Няма ўліку паступаючага матар'ялу і рабочай сілы. А набор рабочай сілы праходзіць самацёкам. Дагаворы з калгасамі не заключаны, „хто прыдзе, таго бяруць, а хто ня прыдзе, дык ня трэба“—разважае адміністрацыя.

### Пануе ўраўнілаўка

Адміністрацыя зусім ніякай увагі не зварачае на ўраўнілаўку, якая яшчэ існуе ў зарплаце і якая тармозіць выкананьне прамфінпляну і паляпшэньне якасьці прадукцыі. Напрыклад, сьлесар, прымацаваны да анучарубкі (менш кваліфікаваная работа), атрымлівае 120 руб., а сьлесар, прымацаваны да папермашыны (кваліфікаваная і адказная работа), атрымлівае 80—90 руб. Да гэтага часу на гэта ўвагі не зварачалі.

### Разгарнуць сацспаборніцтва і ўдарніцтва

Сацспаборніцтвам на фабрыцы ахоплена каля паловы рабочых, але таксама фармальна. Сацдагаворы не правяраліся, такім чынам ніхто ня ведае эфэктыўнасьці сваёй работы. З боку адміністрацыі, ФЗК, партыйных і камсамольскіх ячэек цэху зварачалася слабая ўвага на гэты важнейшы вучастак работы. Слаба разгорнута прэміяваньне ўдарнікаў.

### Рацыяналізацыя на паперы

Работа бюро рацыяналізацыі праходзіла самацёкам. Плян работы адсутнічаў. За чацьверты квартал была падана 51 прапанова. З іх тэхнічным саветам прынята 31, праведзена ў жыцьцё 11, з 20 прапаноў 4 прапановы аднесены на 1932 год, на 4 прапановы даны заказы на другія заводы, а 11 прапаноў нават не разглядаліся. Рацыяналізатары“ — загадчык вытворчасьці Шнэйдэрман, галоўны мэханік Рынк, загадчык мэханічнай майстэрні Рэдзька сыстэматычна затрымлівалі ажыцьцяўленьне рабочых прапаноў. Тэхнічная прапаганда і наогул тэхвучоба пастаўлены вельмі дрэнна. Работа з вынаходцамі не вядзецца, няма рацыяналізатарскіх ячэек. З боку БРІЗ'у, ІТР і фабкому ня было належнага кіраўніцтва тэхвучобай і рацыяналізатарскай работай.

Гэтыя факты, якія сьведчаць аб неперабудаванасьці работы паводле 6 ці ўказаньняў правадыра, сыгналізаваліся заводзкай шматтыражкай, насьценнымі газэтамі фабрыкі, а таксама раённай газэтай. Але на гэтыя факты, якія даваліся ў рабкораўскіх допісах, не рэагавалася з боку заводакіраўніцтва, грамадзкіх арганізацый фабрыкі.

Вось прычыны сыстэматычнага невыкананьня прамфінпляну.

Абязьлічка, ураўнілаўка, зрыў рэалізацыі рабочых прапаноў, нерэагаваньне на допісы, спрыялі гэтаму.

Усе арганізацыі фабрыкі неадкладна павінны перабудаваць работу паводле 6-ці ўказаньняў тав. Сталіна.

Брыгада друку:

**Шарай Вера, Нарбут Маня,**
**Сідараў, Сьвірыдэнка,**
**Палуйчык.**



Агульны выгляд дома ўдарніка для рабочых Маскоўскага заводу „Серп і Молат“

# Больш рашуча праводзіць у жыццё 6 умоў т. Сталіна

*(Рэйд брыгад ударніц „Камунара Магілеўшчыны“ і рэдакцыі часопісі „Работніца і калгасьніца Беларусі“)*

Брыгады праверылі завод „Зьвязда“, цагельні завод № 1, № 2 цукерную фабрыку і бэтонны завод.

Рэалізацыя 6-ці ўмоў т. Сталіна на прадпрыемствах, якія абсьледваліся брыгадамі, праходзіць даволі марудна.

Так, на заводзе „Зьвязда“ яшчэ не ліквідавана абязьлічка. Ёсьць толькі частковае прымацаваньне рабочых да варштатаў.

*Лепш* на бэтонным заводзе і цагельні, дзе абязьлічка ўжо ліквідавана. Дагавор з калгасам аб арганізаваным наборы рабочых з абсьледаваных прадпрыемстваў заключан толькі цукернай фабрыкай. Завод „Зьвязда“ ўсё яшчэ набірае рабочых, якія ідуць самацёкам. А цагельні толькі яшчэ зьбіраюцца гэтыя дагавары заключаць.

Зарплата рабочых амаль усюды пераведзена на зьдзельшчыну. На заводзе „Зьвязда“ раней была калектыўная зьдзельшчына. Зараз на індывідуальную зьдзельшчыну пераведзен лесапільны цэх, але ўвесь завод яшчэ не пераведзен.

Слаба ўкараняецца і гаспадарчы разрахунак у гэтых прадпрыемствах. На заводзе „Зьвязда“ няма яшчэ ні брыгад, ні цэхаў на гаспадарчым разрахунку. Лесапільны цэх рыхтуецца зараз да пераходу на гаспадарчы разрахунак.

На цукернай фабрыцы 4 цэхі пераведзены на гаспадарчы разрахунак, на цагельнях № 1 і № 2 транспарт пераведзен на гаспадарчы разрахунак, на бэтонным заводзе з 1-га сьнежня арганізавалася адна гаспадарча-разрахунковая брыгада, але аб эфэктыўнасьці працы яе яшчэ нічога невядома.

Таксама нездавальняючая справа з бытавым абслугоўваньнем рабочых. Бэтонны завод мае інтэрнат для асфальтавых рабочых, які знаходзіцца ў дрэнным становішчы.

Работніцы цукернай фабрыкі, якія працуюць у аддзяленьні, дзе вараць цукер, працуюць на правейным ветры, у брудзе. Цэх гэты падобен да бруднага, сьмярдзючага падвалу. У іншых цэхах гэтай фабрыкі трошкі чысьцей, але і там ня ўсе санітарныя правілы выконваюцца.

Сталоўкі яшчэ таксама мала зрабілі ў справе паляпшэньня снабжэньня рабочых. Ёсьць некаторае паляпшэньне ў працы сталоўкі цукернай фабрыкі і цагелень, дзе абеды ня дрэнныя, але санітарнае становішча нездавальняючае. На ўсіх праверaных прадпрыемствах нічога ня зроблена ў справе паляпшэньня забесьпячэньня лепшых ударнікаў.

Пры некаторых сталовых ёсьць сьвінарнікі. Сталовая заводу „Зьвязда“ мае сьвінарнік на 40 сьвіней. Мае сьвіней і цукерная фабрыка, але сьвіньні гэтыя надта дрэнна даглядаюцца, стаяць у брудзе, 17 парасят ядуць з аднаго карыта. Неабходна хутчэй аздаравіць умовы, у якіх знаходзяцца сьвіньні.

Слабая ўвага да бытавога абслугоўваньня рабочых прыводзіць да цякучасьці, якая на заводзе „Зьвязда“ складае 15 проц.

Усе прадпрыемствы, які правяраліся брыгадамі, павінны больш рашуча ўзяцца за правядзеньне ў жыццё 6-ці ўмоў тав. Сталіна і гэтым забясьпечыць выкананьне прамфінпляну ў 4-м, заключным годзе пяцігодкі.

Брыгада: **Альтшулер, Вержбаловіч, Міхайлова, Русіян, Двоськіна, Малочнікава, Бернардзкая, Левіна, Падгароднікава, Дальнікава, Церэнцьева, Мэтрык, Фідман, Карнеева, Кісялёва, Тумас.**

# Перабудаваць работу каапэрацыі згодна ўказаньняў т. Сталіна

Пастанова Кастрычніцкага пленуму ЦК УсеКП(б) абгаворвалася на першым зьлёце менскіх работніц прылаўку. Прысутнічала 300 чалавек.

У дакладзе і спрэчках галоўным чынам былі закрануты пытаньні аб перабудове работы каапэрацыі, паляпшэньні якасьці абслугоўваньня пайшчыкаў і ліквідацыі чаргі, аб палітыцы зьніжэньня цэн.

Рэалізацыя 6-ці сталінскіх умоў у крамах каапэрацыі і Белгандлю праходзіць зусім слаба. Яшчэ неканчаткова ліквідавана абязьлічка і ўраўнілаўка ў зарплаце. Ня ўсе крамы яшчэ перайшлі на зьдзельную аплату працы. Гаспадарчы разрахунак невыстрачальна ўкарэнен у крамах. Ва многіх крамах каапэрацыі накладныя расходы не паменшаны, што перашкаджае зьніжэньню цэн.

Часта ў крамах бываюць залежы тавараў, бо не падбіраюць належнага асартымэнту. Ёсьць яшчэ шмат выпадкаў грубых адносін работніц прылаўку да спажыўцоў.

Чаргі ня ўсюды яшчэ ліквідаваны. У гэтым вінавата кіраўніцтва крам. Часта нізкая кваліфікацыя работніц прылаўку і касірш стварае чаргу, бо яны марудна падлічваюць. Трэба арганізаваць курсы для работнікаў крам, для падняцьця іх кваліфікацыі.

У сыстэме крам каапэрацыі і Белгандлю працуе 50 проц. работніц, а на найбольш кваліфікаванай рабоце (загадчыкамі крам і інш.)—вельмі мала работніц. Культурна-палітычны ўзровень работніц прылаўку нізкі. Саюз гандлёва-каапэрацыйных служачых да гэтага часу слаба праводзіць работу сярод работніц прылаўку.

Лепшыя крамы павінны перадаваць свой вопыт другім шляхам правядзеньня вытворчых нарад паміж крамамі. Трэба разгарнуць сацспаборніцтва паміж крамамі і ўзяць на буксір адсталых.

Аб усім гэтым гаварылі ўдзельніцы зьлёгу. Яны таксама скардзіліся на дрэннае бытавое абслугоўваньне работніц прылаўку. Няма сваіх ясьляй. Аб сродках, якія ёсьць у саюзе на паляпшэньне быту работніц ніхто і ня ведае.

Зьлёт прыняў пастанову аб практычных мерапрыемствах па паляпшэньні работы крам на аснове выкананьня 6 ці сталінскіх умоў. У пастанове ярка адзначан удзел работніц прылаўку ў выкананьні гэтых мерапрыемстваў. Пытаньні культбытавога абслугоўваньня работніц прылаўку таксама знайшлі свой адбітак у прынятай пастанове.

Э.

# Павярнуцца тварам да бытавых

## Ліквідаваць чаргі

Работнікі праўленьня ЗРК і крамы № 18 ня добра адносіліся да нашай брыгады. Калі мы папрасілі весткі ў тав. Басіна (заг. крамай), ён нас адаслаў да намесьніка тав. Папавай, а тая зноў адаслала нас да т. Басіна. Таму мы дасканалых вестак аб пляновым забесьпячэньні не атрымалі.

Крамы ЗРК яшчэ не перайшлі на гаспадарчы разрахунак. Па зьніжэньні цэн пакуль што няма ніякіх вынікаў.

Уведзена зьдзельная аплата сярод работнікаў прылаўку. Работнікі прылаўку часта праяўляюць грубасьць да пайшчыкаў, у гэтым нават не без граха і намесьніца загадчыка крамы т. Папова.

Чаргі яшчэ не ліквідаваны, работніцам прыходзіцца стаяць гадзінамі ў чарзе за пайком. Асабліва вялікія чаргі ў хлебнай краме. Часта бывае, што работнікі прылаўку навязваюць пайшчыкам нядобраякасны хлеб. Аддзяленьня „Маці дзіця“ няма. Яго трэба будзе арганізаваць.

Ёсьць некаторыя дасягненьні ў працы ЗРК. Часы работы крам прыстасаваны да ўмоў работніц. Бульбу атрымалі ўсе рабочыя і работніцы. ЗРК добра забясьпечваў работніц абуткам і галёшамі.

Ёсьць фонд для лепшых ударнікаў. Цяпер будуецца спэцыяльная хлебная крама для ўдарнікаў, што значна зьменшыць чаргі.

Вялікім недахопам зьяўляецца тое, што работніцы і жонкі рабочых ня ўцягнуты ў работу праўленьня ЗРК і крамных камісій.

Неабходна ўсе крамы **перавесьці на гаспадарчы разрахунак,** што дасьць магчымасьць хутчэй ажыцьцявіць дырэктыву ЦК аб зьніжэньні цэн.

**Трэба канчаткова ліквідаваць чаргі.** Трэба ўвесьці папярэднія заказы на тавары. У часе выдачы пайкоў патрэбна, каб усе вольныя работнікі прылаўку другіх аддзяленьняў былі перакінуты на гэту работу для хутчэйшага абслугоўваньня.

Праўленьне ЗРК павінна ўцягнуць работніц і жонак рабочых у кантроль над работай крам, асабліва для праверкі колькасьці залежаў пры выдачы пайкоў.

Брыгада: **Пэсіна, А., Міхайлава, С., Каплан, Ш., Фрыдкіна, Д.**

## Хутчэй пабудаваць яслі

На фабрыцы няма сваіх яслей, дзеці работніц знаходзяцца ў агульна-гарадзкіх яслях.

Яслі працуюць на бесьперапынным тыдні ў дзьве зьмены. Работніцы, якія наведваюць школы або заняты грамадзкай работай, маюць магчымасьць пакінуць сваіх дзяцей у яслях на гэты час.

Санітарнае становішча кухні і пакояў здавальняючае, затое дрэннае становішча кладовай, дзе хаваюцца прадукты. У кутках і на вокнах павуціньне. На паліцах пыл. Булкі, крупы, масла ляжаць у незакрытым выглядзе, занесены пылам.

Няма сушылкі для бялізны, яе сушаць у ванным пакоі. Там таксама многа пылу, чым і пакрыта бялізна.

Вадаправоду ў пральні і на кухні няма. Работніцам прыходзіцца насіць ваду. Аб пабудове вадаправоду фабрычныя арганізацыі Нова-Беліцы і не падумалі.

Пры яслях ёсьць пастаянны доктар, які штодзенна аглядае дзяцей, апрача выходных дзён. Харчаваньне досыць спажыўнае і смачнае. Вялікім недахопам зьяўляецца тое, што няма ізялятара для хворых дзяцей. Калі дзіця захварае днём, яго няма куды дзяваць і трымаюць яго не асобна.

Памяшканьне не прыстасавана да яслей. Цесната, не хапае пакояў, зусім малая кубатура, не хапае паветра дзецям.

У яслях не хапае падушак, ёсьць нават выпадкі, калі дзеці сьпяць без падушак.

Фабзаўкомы гораду мала цікавяцца работай яслей. Асабліва гэта назіраецца за фабкомам „Вэзувія“.

ЗРК фабрыкі „Вэзуві“ нават адмовіўся адпусьціць солі для яслей, хаця гэта і не дэфіцітны тавар.

Выхаваўчай работы сярод бацькоў не праводзіцца. Сходы бацькоў увесь час зрываюцца. Бацькаўскі камітэт бязьдзейнічае. Насьценгазэта ўжо з мая месяца ня выходзіць.

У Нова-Беліцы будуюцца новыя раённыя яслі на 35 дзяцей. Але па нядбайнасьці гораддзела аховы здароўя і прафсаюзных арганізацый пабудова яслей ня скончана ў тэрмін—1 мая 1931 г.

Парткалектыў фабрыкі „Вэзуві“ ставіў гэта пытаньне пабальшавіцку, рашуча і дабіўся, што яслі будуць хутка скончаны.

Для паляпшэньня работы існуючых яслей брыгада прапануе пабудаваць ізалятар для хворых дзяцей гораду, чым зьменшыць колькасьць водпускаў работніц па хваробах дзяцей (за апошнія месяцы на аднэй фабрыцы—9 выпадкаў).

Для абслугоўваньня ўсіх дзяцей работніц трэба перавесьці яслі на 3-ю зьмену. Трэба правесьці вадаправод і палепшыць санітарнае становішча кладовай і ваннага пакою, зрабіць сушку для бялізны.

Патрэбна, каб у выходныя дні таксама дзеці былі пад доглядам доктара.

Брыгада: **Лясова, Гаркоўская, Бляхэр, Шлейфэр.**

Ударная брыгада ўпаковачнага цэху ф-кі „Вэзуві“.

пытаньню бытавога абслугоўваньня работніц на фабрыцы „Вэзуві“ — Нова-Беліца

# запатрабаваньняў работніц

## Пабудаваць свой дзіцячы сад

Свайго дзіцячага саду пры фабрыцы няма. Дзеці работніц фабрыкі і фанэрнага заводу абслугоўваюцца 3 ма садамі, якія ёсьць у Нова-Беліцы.

Усе дзіцячыя сады перайшлі на бесьперапынны тыдзень. Але дрэнна, што яны працуюць у адну зьмену і ня могуць абслугоўваць дзяцей работніц другіх зьмен і такіх, якія заняты грамадзкай работай.

Не ва ўсіх садох чыста. У кухні саду імя Вароўскага брудна і пыльна. Няма цёплай прыбіральні. Такое-ж становішча і ў садзе „Першага мая“. Прыбіральняй служыць кухня ў гэтых садох. На кухні саду імя Сталіна няма стала і пограб няспраўны. Бульба хаваецца на кухні і частка памерзла.

У садох мала цацак, ложак і коўдраў. У сувязі з гэтым ня ўсе дзеці сьпяць удзень.

У дзіцячых садох няма пастаяннага доктара. Іх абслугоўвае адзін доктар, які таксама абслугоўвае і школы. Зразумела, што ён перагружан і не спраўляецца. Калі дзіця захварэе, яго накіроўваюць дамоў без агляду доктара. Ізалятара няма ў дзіцячых садох. Гэта дрэнна, бо можна заносіць заразу.

Якасьць харчаваньня нездавальняючая, мала тлушчаў і мяса. На 75 дзяцей адпускаецца 1½ кгр. мяса ў дзень. Малака зусім не адпускае ЦРК і яго прыходзіцца купляць на прыватным рынку. За апошні час зусім адсутнічаюць фрукты, гэта сьведчыць аб нядбайных адносінах ЦРК, які ня выконвае пастановы ЦК аб лепшым забесьпячэньні дзіцячых устаноў. Фабрычныя арганізацыі Нова-Беліцы таксама ня прымаюць рашучых мер для паляпшэньня снабжэньня.

Пастанова ЦК КП(б)Б аб усеагульным дашкольным выхаваньні невядома парткалектыву і фабкому. Згодна гэтай пастановы ў 1932 годзе ўсе дзеці рабочых і 50 проц. дзяцей працоўнага насельніцтва павінны быць ахоплены дашкольным выхаваньнем. Здавалася-б, што гэта пастанова абавязвае да дзейнасьці, бо сетка павінна быць пашырана, а тут аб пабудове свайго дзіцячага саду і ня думаюць. Інспэктура нарасьветы таксама нічога ня робіць. Яна перад фабрычнымі арганізацыямі ня ставіць рашуча гэтага пытаньня.

У садох не разгорнута грамадзкая работа. Насьценгазэта выходзіць рэдка. Сходы бацькоў таксама рэдка адбываюцца.

Фабрычна-заводзкія арганізацыі і гарінспэктура асьветы павінны палепшыць санітарнае становішча, прымацаваць пастаяннага доктара і забясьпечыць абсталяваньнем і цацкамі, адвесьці пакой для ізалятара. Трэба разгарнуць сацспаборніцтва паміж дзіцячымі садамі на лепшую, узорную пастаноўку работы і выхаваўча-пэдагагічную работу з бацькамі. Трэба ажывіць работу насьценных газэт дзіцячых садоў.

Брыгада: **Фадеева, Васілеўская, Найстэтэр, Малабалава, Кузьняцова і Табухава.**

## У яськях чыста, харчаваньне спажыўнае

Яські пры фабрыцы „Камінтэрн“ нядаўна пабудаваны. Яны абслугоўваюць 100 дзяцей у 3 зьмены.

У памяшканьні яськяй чыстата. Для кожнай зьмены ёсьць асобная бялізна. Ёсьць ізалятар. Ненармальна толькі тое, што пакой, дзе прымаюцца дзеці, халодны. У спальнях цеснавата. У адным пакоі сьпяць 15—18 дзяцей. Няма таксама пральні, яна зьмяшчаецца ў ванным пакоі.

Харчаваньне добраякаснае і досыць спажыўнае. Тлушчы даюцца ў патрэбнай колькасьці, але мала гародніны і фруктаў.

Дзякуючы ўвазе дырэкцыі і фабрычных арганізацый, дзецям пашыта верхняя вопратка з рэштак мануфактуры, якую дырэкцыя адпусьціла мацерам па сабекошце. У гэтай вопратцы дзеці гуляюць удзень на дварэ. Дрэнна тое, што зусім нама цёплага абутку. Гэта перашкаджае дзецям доўга гуляць на паветры ў халодныя дні.

У яськях арганізавана палітшкола для бацькоў і абслугоўваючага пэрсаналу. Ёсьць камітэт бацькоў, але ён слаба працуе, няма таксама насьценнай газэты.

У яськях ёсьць пастаянны доктар. Яна зацікаўлена сваёй работай. Раз у месяц яна робіць дасканалы агляд дзяцей, знадворны—кожны дзень. Доктар часта чытае лекцыі бацькам на розныя тэмы.

Брыгада знаходзіць, што неабходна пабудаваць закрытую вэранду, каб выносіць грудных дзяцей на сьвежае паветра. Яські павінны быць лепш абсталяваны. Таксама трэба ўбраць пральню з ваннага пакою, бо гэта перашкаджае сваячасоваму купаньню дзяцей.

Трэба ўжо фабкому заняцца пытаньнем пераводу яськяй на летні час у дачнае месца.

Пры фабрыцы няма дзіцячага саду. Для эканоміі сродкаў трэба да будынку яськяй дабудаваць некалькі пакояў і абсталяваць дзіцячы сад. Кухня вялікая і яна можа абслужыць апрача яськяй і дзіцячы сад.

Кіраўніца старшай групы ня досыць падрыхтавана і мала ўвагі аддае дзецям. Трэба падабраць кіраўніцу, якая-б апавядала патрэбам яськяй.

Трэба пабудаваць прыбіральню бо цяцер пад прыбіральняй заняты вялікі пакой у той час, як у спальні цесна.

Брыгада лічыць ненармальным, што яські не дагружаны ў другой і 3-яй зьмене. Фабкому трэба правесьці больш глыбокую растлумачальную работу сярод работніц, азнаёміць іх з работай яськяй і выгоднасьцю іх. Трэба таксама растлумачыць работніцам, каб яны не спазьняліся прыносіць дзяцей, бо гэта адбіваецца на нармальнай рабоце яськяй.

Брыгада часопісі „Работніца і калгасьніца Беларусі“ і шматтыражкі „Камінтэрнавец“:

**Мэльцэр, Мулер.**

# ПАМЯЦІ ЗМАГАРОЎ ПРАЛЕТАРСКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ

13 год прайшло з дня забойства Розы Люксэмбург і Карла Лібкнэхта, забойства, аб якім Ленін пісаў, што „не знайсьці слоў для выражэньня ўсяго паганства і нізасьці гэтага катаваньня". Кроў Розы Люксэмбург і Карла Лібкнэхта—яснага розуму і палкага сэрца нямецкага пралетарыяту—яшчэ не адпомшчана. Але яна нарадзіла сотні тысяч новых змагароў, якія пад сьцягам Камуністычнага Інтэрнацыяналу штурмуюць капітал стычны сьвет. Гэты штурм увянчаецца перамогай сацыялістычнай рэвалюцыі. Адна з умоў гэтага—зжываньне і перамаганьне міжнародным камуністычным рухам тых вялікіх палітычных памылак, якія дапусьціла Роза Люксэмбур (аналёгічныя памылкі рабіў і Карл Лібкнэхт).

Нам бязьмерна дорага памяць адважных пралетарскіх змагароў. І іменна таму мы адкідаем усё антымаркcысцкае, антыбальшавіцкае, антыленінскае ў тэорыях і поглядах Розы Люксэмбург. Якраз таму мы крытыкуем памылкі Розы Люксэмбург і на барацьбе з гэтымі памылкамі выхоўваюцца кадры Камуністычнага Інтэрнацыяналу. Бяз гэтага ня можа быць перамогі пралетарскай рэвалюцыі, за справу якое адважна змагалася і загінула Роза Люксэмбург.

Усе ворагі бальшавізму, ворагі рэвалюцыі, шылі і шыюць сабе з памылак Розы Люксэмбург контррэвалюцыйныя сьцягі для барацьбы з міжнародным камуністычным рухам. Зараз гэтым напе-рабой займаюцца брандлерыянцы і трацкісты. Ленін наконт гэтага пісаў: „...Арлом здараецца і ніжэй курэй спускацца, але курам ніколі, як арлы, ня ўзьняцца. Роза Люксэмбург памылялася ў пытаньні аб незалежнасьці Польшчы; памылялася ў 1903 годзе ў ацэнцы меншавізму; памылялася ў тэорыі накапленьня капіталу, памылялася, абараняючы ў ліпені 1914 году побач з Пляханавым, Вандэрвэльдэ, Каўцкім і інш. ідэю аб'яднаньня бальшавікоў з меншавікамі; памылялася ў сваіх турэмных пісаньнях 1918 году (прычым сама-ж па выхадзе з турмы ў канцы 1918 і початку 1919 гадоў выправіла большую частку сваіх памылак). Але, ня гледзячы на гэтыя свае памылкі, яна была і застаецца арлом. „Нямецкая сацыял-дэмакратыя пасьля 4-га жніўня 1914 году—сьмярдзячы труп"—вось з якім выразам Розы Люксэмбург увойдзе яе імя ў гісторыю сусьветнага рабочага руху. А на заднім дварэ рабочага руху, сярод куч гною, куры накшталт Паўля Леві, Шэйдэмана, Каўцкага і ўсёй гэтай браціі, зразумела, будуць асабліва захапляцца памылкамі вялікай камуністкі. Кожнаму сваё". (Ленін, том XX, частка другая, старонка 490—491).

Кожнаму сваё. Склалася ўжо такая традыцыя рэнэгатаў *) кожны з іх хоча пахіснуць сусьветны камуністычны рух памылкамі Розы Люксэмбург. „Паўль Леві жадае пяпер асабліва выслужыцца перад буржуазіяй... перадаючы як-раз тыя творы Розы Люксэмбург, у якіх яна ня мела рацыі". (Ленін).

Сьледам за Паўлем Леві гэты шлях прарабілі і робяць іншыя рэнэгаты камунізму, якія ператварыліся ў агентаў буржуазнай контр-рэвалюцыі; Брандлеры, Коршы, Троцкія. Гэта стары манэўр рэнэгатаў, **Завастрэньне ўвагі партыйных кадраў на памылках Розы Люксэмбург, выхаваньне кадраў на барацьбе з сацыял-фашыстамі** і іх трацкісцка-брандлерыянскімі саюзьнікамі, якія і **цяпер спэкулююць на гэтых памылках**,—адна з важнейшых прадпасылак перамаганьня тэй справы, за якую Роза Люксэмбург загінула.

У лістох Розы Люксэмбург, якія нядаўна апублікаваны інстытутам Леніна на польскай мове, ёсьць адзін надзвычай цікавы ліст. Роза Люксэмбург у гэтым лісьце, які адрысован Тышко, перадае сваю гутарку з Бэбэлем і Каўцкім адносна байкоту выбараў у дзяржаўную думу.

„Учора ўвечары—піша Роза Люксэмбург,—Аўгуст (Бэбэль.—*Г. В.*) прызнаваўся мне, што ён за ўдзел у выбарах у думу (Адлер яго, мусіць, накруціў). Ён пачаў са мной спрачацца. А мой Карл (Каўцкі.—*Г. В.*) нясьмела, праўда, яго падтрымліваe, гэта мяне трошкі злавала. Паміж іншым, Аўгуст папракаў мяне (па-таварыску) у ультрарадыкалізьме і сказаў: „Запамятайце, калі адбудзецца рэвалюцыя ў Германіі, Роза будзе на левым флянгу, а я на правым", і дадаў жартам: „але мы яе павесім. Не дазволім, каб яна нам плявала ў кашу". Я спакойна яму адказала: „Яшчэ невядома, хто каго павесіць". Характэрна".

Усё-ж Роза Люксэмбург баялася расколу з апартуністамі і цэнтрыстамі.

Тав. Сталін зусім правільна адзначыў, што „левыя сацыял-дэмакраты ў II Інтэрнацыянале і перш за ўсё ў нямецкай сацыял-дэмакратыі, прадстаўлялі слабую і нямоцную групу, арганізацыйна не аформленую, ідэалёгічна непадкаваную групу, **якая баялася нават выгаварыць слова „разрыў", „раскол"**... (падкрэсьлена намі—*Г. В.*).

А сацыял-дэмакраты сапраўды забілі Розу Люксэмбург, праўда, не павесілі, а разарвалі.

Але барацьба за пралетарскую рэвалюцыю ня скончылася, барацьба праводзіцца далей, і сёньня над магіламі арлоў пролетарскай рэвалюцыі, над магіламі Розы Люксэмбург і Карла Лібкнэта, ня толькі схіляюцца жалобныя сьцягі сусьветнага пралетарыяту. Адбываецца мабілізацыя сіл. Паміж нарастаюць. Усеагульны эканамічны крызіс паглыбляецца; хваля рэвалюцыі ўзьнімаецца. Над палямі Манчжурыі, над густой сеткай ваенных правакацый імпэрыялістаў блукае здань палкага змагара з мілітарызмам, цень Карла Лібкнэхта. І цяпер апошні яго артыкул, які ён напісаў напярэдадні свайго забойства, таксама гучыць, як лёзунг барацьбы і пароль перамогі.

**„Высока ўздымаюцца хвалі падзей... Але наш карабель трымае рашуча і горда свой курс на канчатковую сваю мэту, на перамогу.**

**Будзем мы яшчэ жывыя, ці не, калі будзе дасягнута гэта перамога, але наша праграма будзе жыва; яна аўладае ўсім сьветам вызваленага чалавецтва, ня гледзячы ні на што.**

**... Масы пралетарыяту прачнуцца ад грозных рокатаў эканамічнага крушэньня, якое набліжаецца, як ад трубных гукаў страшнага суда. Тады ўваскроснуць трупы забітых байцоў і запатрабуюць справаздачы ад праклятых забойцаў. Сёньня чуецца толькі падземны гул вулкана, але заўтра вулкан выбухне агнём і патокамі сваёй гарачай лявы, ён усіх іх забойцаў пахавае".**

**Г. Васількоўскі.**

„Правда".

*) Здраднікаў.

# БОЛЬШ УВАГІ ВУЧОБЕ

Ператварэньне БССР у 1932 г. ў краіну суцэльнай пісьменнасьці—факт вялікай палітычнай важнасьці. Некаторыя лікпункты і школы малапісьменных зразумелі ўскладзеныя на іх абавязкі і працуюць добра. Напрыклад, лікпункт і школа малапісьменных вёскі Рыжкавічы (Шклоўскі раён) працуе ўзорна. Настаўнік **Лабузноў** акуратна кожны дзень займаецца ў школе з 7-мі да 10 гадзін.

У школе малапісьменных 40 чалавек і на лікпункце 14, з іх 44 жанчыны. Уважлівыя адносіны да працы лікпункту і школы з боку Рыжкаўскага сельсавету спрыяюць актыўнаму наведваньню. Няпісьменнасьць і малапісьменнасьць сярод жанчын у калгасе „Случ" (Слуцкі раён) цалкам ліквідавана. Зараз калгасьніцы папаўняюць свае веды ў палітгуртках—піша селькор Алесь Шпакоўскі.

У калгасе „Зьезд саветаў" ліквідацыя няпісьменнасьці і малапісьменнасьці сярод жанчын—у поўным разгары. Лікпункты працуюць. Няпісьменныя жанчыны ўжо навучыліся пісаць. Разам з тым ёсьць і такія, якія да гэтага часу не перабудавалі сваёй работы. Лікпункт і школа малапісьменных фабрыкі „Спартак" налічваюць 66 чалавек. Але-ж наведваюць 5-6 чалавек, а не то і зусім адзін. Найважнівыя адносіны з боку ФЗК „Спартак" да гэтай працы спрыяюць зрыву вучобы. (З пісьма рабкоркі).

Лікпункт вёскі Таль (Любанскі раён) зусім не працуе. Ёсьць шмат жанчын, якія жадалі-б вучыцца, а тут няма дасканалага падліку няпісьменных.

Кепска працуе лікпункт вёскі Шапчына і Оршаль (Старадароскі раён), як відаць з допісаў селькора Коўгі Харлана. Гэтыя факты сьведчаць аб тым, што неабходна яшчэ больш згуртаваць увагу грамадзкасьці на пытаньнях ліквідацыі няпісьменнасьці.

На занятках фізычнага габінэту БДУ.

## Абавязаліся да 1-га мая ліквідаваць сваю няпісьменнасьць

У калгасе „Расьвет новага жыцьця" адкрыт лікпункт. Усе жанчыны наведваюць заняткі.

Цікава адзначыць, з якою хцівасьцю вучыцца 42-х гадовая **Пратапчык** Хрысьціна. Да гэтага часу яна была зусім няпісьменнай. Цяпер яна па ўдарнаму ўзялася ліквідаваць сваю няпісьменнасьць. Цэлымі начамі яна праседжвае над лемантаром.

Але ў той час, калі старая так добра вучыцца, маладая дзяўчына **Пратапчык** Параска не стараецца ліквідаваць сваю няпісьменнасьць.

Усе жанчыны абавязаліся да 1-га мая ліквідаваць сваю няпісьменнасьць.

Настаўнік тав. **Новік** вельмі добра разгарнуў культработу сярод жанчын.

**Емяльлянава Ганна.**

Старадароскі раён.

## Даць кіраўніка дэлегацкага сходу

У камуне „Зьвязда" зусім ніякай культработы з жанчынамі не праводзіцца. Дэлегацкія сходы таксама ўжо 5 месяцаў не працуюць, бо няма кіраўніка. Трэба было гэтай справай заняцца парт'ячэйцы, якая тут ёсьць. Неабходна ячэйцы прачнуцца, даць кіраўніка дэлегацкаму сходу і наладзіць культработу з жанчынамі.

**Плявака.**

## Наладжваецца культработа

Да 1931 году ў вёсцы Ўбібацькі, Гарадзячыцкага сельсавету (Любаньшчына), не праводзілася ніякай культпрацы сярод жанчын.

За апошні час, пачынаючы з чэрвеня 1931 г. культпраца сярод жанчын пачала наладжвацца. Парт'ячэйка ўзялася за гэту справу. Пры дэлегацкай групе з 25 чалавек арганізаваны наступныя гурткі: палітычны, санітарны і драматычны. Вылучаны адпаведныя кіраўнікі. Праца гурткоў ідзе належным парадкам.

**В. Яўстрат.**

# Часопісь „Работніца і Калгасьніца Беларусі" ў масы

## За 100 проц. падпіску

Работніцы менскай швэйнай фабрыкі імя Крупскай уключыліся ў конкурс на лепшае распаўсюджваньне часопісі „Работніца і калгасьніца Беларусі" і выклікалі на сацспаборніцтва работніц фабрык імя 8-га сакавіка і „Камунарка".

Работніцы абавязаліся дабіцца таго, каб кожная работніца і жонка рабочага выпісвалі і чыталі сваю часопісь. Разгорнута сацспаборніцтва паміж істужкамі на лепшае правядзеньне падпіскі. Работніцы абавязаліся ахапіць 100 проц. гадовай і паўгадовай падпіскай работніц прадпрыемства.

Работніцы таксама абавязваліся трымаць цесную сувязь з рэдакцыяй, разгарнуць масавую работу вакол часопісі, арганізаваць галосную чытку яе ў часе абедзеных перапынкаў і пісаць у сваю часопісь.

**Е.**

## Мы выклікаем

Курсанткі каапэрацыйных курсаў—жонкі начскладу гомельскага гарнізону РСЧА ў ліку 23 чалавек падпісаліся на 6 месяцаў на часопісь „Работніца і калгасьніца Беларусі". Выклікаюць пасьледваць іх прыкладу ўсіх жонак начскладу Менскага гарнізону і жанчын, што працуюць у закрытых вайсковых каапэратывах.

**Мальцава.**

# За шырокае разьвіцьцё сацыялістычнага птушніцтва

Побач з разьвіцьцём высока-таварнай сацыялістычнай жывёлагадоўлі, шырокае разгортваньне штушніцтва і трусагадоўлі мае вялізарнае значэньне ў справе паляпшэньня рабочага снабжэньня.

Для гадоўлі птушкі і трусоў патрабуецца зусім кароткі тэрмін. Праз шырокае разгортваньне і правільную пастаноўку птушніцтва і трусагадоўлі за кароткі пэрыяд можна дабіцца вялікіх вынікаў у справе паляпшэньня снабжэньня рабочых мясам і яйкамі.

За тэрмін меншы аднаго году ў БССР арганізавана 187 птушкаводчых калгасных фэрм, 10 птушніцка-трусагадоўчых саўгасаў і 20 трусагадоўчых калгасных фэрм. У гэтых саўгасах, калгасных і каапэрацыйных птушкаводчых фэрмах налічваецца 69 тысяч штук усіх відаў птушкі. Саўгасы і калгасы ў 1931 годзе здалі дзяржаве 92 тысячы яек і 142 цэнтнэры (855 пудоў) птушынага мяса. Зразумела, што гэта зусім нязначная колькасьць у параўнаньні з тымі вялізарнымі магчымасьцямі, якія ў нас ёсьць у гэтым напрамку.

Частка раёнаў і калгасных-птушкаводчых фэрм дабілася вялікіх посьпехаў у справе ўкамплектаваньня. Напрыклад, **Шклоўскі—на 89 проц., калгас імя Сталіна, Полацкай ІПС (інкубатарнай-птушкаводчай станцыі) выканаў плян камплектаваньня на 90 проц., калгас „Шляхі калектывізацыі", Слуцкай ІПС—на 95 проц., калгас „Новая вара"—на 95 проц., калгас „Новае жыцьцё", Заслаўскага раёну—на 105 проц.**

У той-жа час значная частка раёнаў і калгасаў, у якіх намечана арганізацыя птушкаводчых фэрм, недаацэньваюць справы разьвіцьця птушніцтва, зрываюць пляны камплектаваньня птушкаводчых фэрм, патураюць кулаку, які шалёна агітуе супроць гэтай справы і гэтым самым перашкаджаюць вырашэньню мясной праблемы. Калгас „Свабода" Менскае ІПС) выкачаў плян камплектаваньня толькі на 2 проц., калгасы імя Сталіна і „Пяцігодка, (Менскай ІПС), імя Молатава (Полацкай ІПС) „Гарадок" (Гомельскай ІПС) зусім нічога не зр білі для камплектаваньня птушкаводчых фэрм і не паставілі на фэрмах ніводнае птушкі.

Дзякуючы нядбайнасьці, безгаспадарчасьці, адсутнасьці правільнага догляду птушкі, некаторыя саўгасы і птушкаводчыя калгасы маюць вялікія страты. У калгасе „Чырвоны ўсход", Заслаўскага раёну, загадчыкам птушкаводчай фэрмы вылучылі кулака, які пралез у калгас. У выніку шкодніцкай работы гэтага кулака ўсе племянныя кураняты, прывезеныя ў гэты калгас, загінулі. У калгасе „Новае жыцьцё" таго-ж раёну, дзе за птушкай **наглядае калгасьніца—былая батрачка тав. Дубавік такія-ж племянныя кураняты амаль усе выгадаваліся і зараз фэрма ў гэтым калгасе ўкамплектавана птушкаю на 105 проц.** У калгасе „Апора саветаў" ад недакорму загінулла 36 штук курэй.

З прычыны дрэннага догляду, адсутнасьці сьвятла і вэнтыляцыі ў куратніках у частцы саўгасаў і калгасаў усё яшчэ ёсьць вялікі адыход куранят, які па птушкаводчых калгасных фэрмах у сярэднім складае 32 проц. Зусім нізкі (46 проц.) выхад куранят з інкубацыі (інкубатар—машына для штучнага выводу куранят). Мы пішам аб гэтых недахопах для таго, каб мабілізаваць увагу калгасьнікаў і калгасьніц, рабочых і работніц саўгасаў на рашучае зьнішчэньне гэтых недахопаў, барацьбу са стратамі ў птушніцтве, барацьбу за высокую таварнасьць птушкаводчых саўгасаў і калгасаў.

Партыяй і ўрадам на 1932 год пастаноўлена давесьці агульнае пагалоўе птушкі ў саўгасах і калгасных фэрмах да 885 тысяч шт. Птушкаводчыя саўгасы і калгасы ў 1932 годзе павінны здаць дзяржаве 2 мільёны 300 тысяч яек і звыш 4 тысяч цэнтнэраў мяса. Для забесьпячэньня выкананьня гэтага пляну птушкаводчыя саўгасы і калгасы, партыйныя ячэйкі і прафсаюзныя арганізацыі птушкаводчых саўгасаў, праўленьні птушкаводчых калгасаў абавязаны перабудаваць сваю работу на аснове выкананьня 6-ці умоў тав. Сталіна ў галіне птушніцтва. Неабходна давесьці рашучую барацьбу са стратамі ў галіне птушніцтва.

Работніцы саўгасаў і калгасьніцы, праўленьні птушкаводчых саўгасаў, прафарганізацыі і праўленьні калгасаў у цэнтры сваёй увагі павінны паставіць барацьбу за найбольшы выхад куранят з інкубацыі, поўнае зьнішчэньне адыходаў (падзяжу) маладняка ўсіх відаў птушкі, праз правільную арганізацыю кармленьня і догляду куранят. Трэба вывучыць і перанесьці ў адстаючыя саўгасы, калгасы і раёны вопыт перадавых раёнаў, саўгасаў і калгасаў, вопыт работы лепшых ударнікаў.

Жаночая праца ў галіне птушніцтва зьяўляецца рашаючай. Таму парт'ячэйкі птушкаводчых саўгасаў і калгасаў асаблівую ўвагу павінны аддаць справе падбору і падрыхтоўкі кадраў калгасьніц для работы на птушкаводчых фэрмах, у калгасах, у птушкаводчых цэхах саўгасаў і на інкубатарных станцыях. Работа дэлегацкіх пунктаў у птушкаводчых саўгасах і калгасах павінна быць падпарадкавана барацьбе за выкананьне плянаў разьвіцьця птушніцтва.

У бліжэйшы час часопісь „Работніца і калгасьніца Беларусі" будзе шырока на сваіх старонках асьвятляць вопыт работы перадавых саўгасаў і калгасаў, вопыт работы лепшых ударнікаў у галіне птушніцтва, а таксама будзе зьмяшчаць матар'ялы па пытаньнях арганізацыі працы птушкаводчых саўгасаў і калгасаў, кармленьне і догляду птушкі і тэхнікі правядзеньня інкубацыі. **П. А.**



Трусятнік.

# Сабраць ня менш 30.000 тон попелу

Згодна пастановы ЦК КП(б)Б аб падрыхтоўцы да правядзеньня веснавой сельска-гаспадарчай кампаніі, па БССР павінна быць сабрана ня менш 30 тысяч тон попелу. Выкананьне гэтай лічбы патрабуе мабілізацыі ўсёй грамадзкасьці (камсамолу, ячэек Асоавіяхіму, піянэр-арганізацыі школьнікаў і інш.).

Кожны завод, фабрыка, колгас, саўгас, аднаасобная гаспадарка павінны надаць вялікую ўвагу збору попелу, як дармавому ўгнаеньню, якое павышае ўраджайнасьць.

## На якіх глебах трэба ўносіць попел

Добрыя вынікі дае попел тады, калі яго правільна скарыстоўваць у гаспадарцы, як угнаеньне. Патрэбна кожнаму саўгасьніку, саўгасьніцы, калгасьніку і калгасьніцы памятаць, што добрую эфэктыўнасьць дае попел тады, калі яго ўносіць на глебах падзолістых, тарфяных, пясчаных і лёгкіх сугліністых, а такія тыпы глеб у БССР пераважаюць. Вось таму на попел, як угнаеньне, у нас у БССР патрэбна зьвярнуць асаблівую ўвагу.

Попел, як угнаеньне лепш даваць, пад кораньплоды, віку, канюшыну, бульбу, лён і гарох. Таксама попел добра скарыстоўваць на сенажацях.

Попел патрэбна ўносіць у глебу ў сухое надвор'е, мерна рассыпаць па полі і зараз-жа забаранаваць жалезнаю бараною ці плугам на глыбіню 6—9 сант. Угнойваць глебу патрэбна за 2 тыдні да пасеву. Пад бульбу можна ўносіць попел у часе яе пасадкі. Для гэтага бярэцца 1 частка попелу і 3 часткі глебы, перамешваецца і насыпаецца ў кожную баразну, або пад кожную бульбіну.

## Як захоўваць попел

Ад якасьці захоўваньня попелу залежыць і якасьць самога попелу.

Ня гледзячы на рад пастаноў НКЗ і СНК БССР, усё-ж такі многія арганізацыі недаацэньваюць важнасьці добрага захоўваньня попелу. Патрэбна кожнаму саўгасьніку, калгасьніку, калгасьніцы і саўгасьніцы ведаць, што калі попел прамочыць дождж, то разам з вадою вышчалачацца і спажыўныя матэрыі, якія ёсьць у попеле.

Для добрага хаваньня попелу пабудаваць драўляныя скрыні з накрыўкамі, у якія б не праходзіла вада. Над скрыняй патрэбна пабудаваць паветку. Гэта дасьць гарантыю, што вада не пападзе ў скрыню і не папсуе попелу.

Адначасова кожнаму калгасу, саўгасу патрэбна вылучыць аднаго, або двух чалавек, якія-б адказвалі за правільнае захаваньне попелу. Вялікую карысьць у гэтым кірунку могуць адыграць піянэры. Піянэры або школьнікі, якія могуць зьбіраць попел у гаспадарках і засыпаць яго ў прыгатаванае для гэтай мэты спэцыяльнае месца. Наогул у справу добрага і правільнага захаваньня попелу, як дармовага ўгнаеньня, павінна быць уцягнута ўся грамадзкасьць калгасу, саўгасу, заводу, дзе зьбіраецца попел.

Попел можна захоўваць у ямах. Але сьценкі такіх ям павінны быць абавязкова глінянымі і добра ўтрамбаванымі. Над ямаю павінна быць пастаўлена паветка. Яму лепш капаць на высокім месцы, куды-б не магла падыйсьці вада.

30.000 тон попелу павінна быць сабрана. Работніца, калгасьніца, саўгасьніца, працоўная жанчына, прымі актыўны ўдзел у зборы дармовага ўгнаеньня—попелу.

Аграном **Маркавец.**

# Дрэва як золата

З дрэва зрабілі пэнал для Міколы,
З дрэва і санкі маленечкай Волі.
Козевы лыжы, кароўка ў Хасі,
Шмат іншых цацак прыгожых, цікавых.
Татка ўвесь ў стружках прыходзіць з заводу,
Ўзяў на завод ён аднойчы Міколу.
Колькі там дрэва—прайсьці небясьпечна,
Колькі нароблена розных там рэчаў:
Шмат там буфэтаў, сталоў, этажэрак,
Ложкаў, камодаў і крэслаў для дзетак.
Усё так прыгожа, выгодна, да рэчы,
Людзям на патрэбу ідзе ўсё бясспрэчна.
З заводу Мікола паехаў ў трамваі,
Ў вакно пазіраў ён улева—ўправа.
Новы вось дом і прыгожы на дзіва,
Будуць рабочыя жыць ў ім шчасьліва.
— Дамы і трамваі і гэны масток
зроблены з дрэва, мой ты сынок.
Лета. Уздоў-ж рэчкі нясецца, вунь, лодка...
Мікола вяслом б'е умела і лоўка.
А вочы заплюшчыць—ня рэчка, а мора,
Карабель, а ня лодка—плыве у прасторы.
Высокія мачты, глыбокія хвалі...
Плыве карабель наш ўсё далей ды далей...
Мікола ня хоча быць доўга матросам,
Вось ён капітан параходу і—досыць.
Вядзе параход той людзей нязьлічона
і хутка праедуць праз ўсё яны мора.
Усе параходы, караблік і лодка
Зроблены з дрэва, наш дружа Мікола.
Дрэва—як золата, трэба хаваць,
ў крыўду нікому яго не даваць.
Брыдкія людзі, дрэва што губяць,
дзеля пацехі сякуць яго, рубяць.
Скачуць ля ёлкі калядныя дзеткі,
мамы якіх ня бывалі ў саветах.
Кніжак, газэты яны ня чытаюць,
і ходзяць у царкву, каляды спраўляюць.
Мікола хай скажа тым мамам і дзеткам,
што дрэва—як золата, трэба саветам—
Для нашай будоўлі, на новае жыцьцё,
зайздросьціць хай вораг, кусаючы кіпці.
Хай скажа Мікола тым мамам і дзеткам
Пра хітрых папоў відавочныя плёткі.
Зусім зразумела, што бога няма,
а попікам грошай давай, каляда.
Мікола-ж ня верыць ні ў чорта, ні ў бога,
шырока лягла перад Міколай дарога.
Вучыцца ад лепшых жыцьцё будаваць,
—ў чатыры, няйначай закончыць пяць.

**Ю. П. Тупяневіч.**

Цана асобнага нумару 10 кап.

# Парады доктара

## Як зьберагчы дзіця раньняга ўзросту ад заразьлівых хвароб

**Успрыймальнасьць да хваробы ў дзяцей раньняга ўзросту часьцей за ўсё бывае там, дзе дрэнны догляд дзіцяці, дзе няправільна настаўлена кармленьне, слаба ажыцьцяўляецца санмінімум, існуюць забабоны.**

Пад прафіляктыкай мы разумеем усе тыя мерапрыемствы, якія павінны ахаваць дзіця ад заразы. Сюды адносяцца правільна наладжанае кармленьне, аб чым мы будзем гаварыць у далейшых нашых гутарках, і добры догляд, аб чым пісалі ўжо ў ранейшых нашых гутарках.

Сёньня мы спынімся на пытаньні аб тым, як наладзіць гігіену памяшканьня ў якім знаходзіцца дзіця. Пакой павінен трымацца ў чыстаце, нідзе не павінна быць ні павуціньня, ні пылу. Праветрываць трэба штодзенна. У летні час дзіця павінна быць увесь час на дварэ ў цяньку, або на вэрандзе, трэба цэлы дзень праветрываць памяшканьне. У зімні час праветрываць шляхам адчыненьня фортак, а калі жадаюць, каб фортка была адчынена доўгі час, яе завешваюць мярлай. Вельмі добра праветрываць у той час, калі паліцца печка.

**Убіраецца памяшканьне мокрай шчоткай, або мокрай анучкай.**

**Нельга ў пакоі выпыльваць мяккую мэблю, а таксама забараняецца пляваць і кідаць акуркі на падлогу.**

**Мухі вельмі, часта зьяўляюцца разносчыкамі заразы, таму, трэба з імі весьці рашучую барацьбу.**

**Трыманьне ў жылым памяшканьні хатняй жывёлы забараняецца. Наогул гігіена памяшканьня ёсьць адзін са сродкаў прафіляктыкі супроць заразьлівых хвароб.**

**Самі дарослыя людзі зьяўляюцца вельмі часта перадатчыкамі заразы. Шкодна чыхаць, кашляць каля дзяцей і цалаваць іх. У часе догляду дзіцяці неабходна сачыць за чыстатой рук. Дарослыя людзі вельмі часта зьяўляюцца насьбітамі бацылаў. Гэта значыць ёсьць такія людзі, якія ў сучасны момант не зьяўляюцца хворымі заразьлівымі хваробамі, але могуць у сваім кале, або глотцы мець заразьлівыя мікробы і вельмі лёгка перадаць гэту заразу дзецям.**

**Такія хваробы лёгка могуць перадавацца ад аднаго дзіцяці другому. Асабліва часта гэта бывае ў так званы захаваны пэрыяд хваробы, які дактары завуць інкубацыйным пэрыядам, калі дзіця ўжо заразілася, але хвароба яшчэ не паказвае сваіх прымет.**

**У мэтах прафіляктыкі мы патрабуем сваячасовага ізаляваньня заразьлівага хворага і правядзеньня добрай дэзынфэкцыі.**

Добрую дапамогу мы маем пры ўжываньні прафіляктыкі дзіцячых заразьлівых хвароб у спэцыяльных сыраватках і вакцынах. Ужываньне гэтых вакцын і сываватак мы называем *забясьпечваючымі прышчэпкамі* супроць заразьлівых хвароб.

Ня трэба ўхіляцца ад гэтых прышчэпак, ня трэба іх баяцца таму, што іх ужываюць з мэтай зьмяншэньня захворваньня дзяцей і з мэтай зьніжэньня дзіцячай сьмяротнасьці. Ужываньне прышчэпак не павінна ставіцца на другі плян мерапрыемстваў па сангігіене. Сангігіена і ліквідаваньне санітарнай і агульнай няпісьменнасьці і поўнае адмоўленьне ад забабонаў стаяць на першым месцы ў справе прафіляктыкі заразьлівых хвароб.

Д-р **Альшванг**.

ЗДАВАЙЦЕ

ПАДПІСКУ
НА ЧАСОПІСЬ

РАБОТНІЦА і КАЛГАСЬНІЦА
БЕЛАРУСІ

ЧАСОПІСЬ
ВЫХОДЗІЦЬ
3 РАЗЫ
Ў МЕСЯЦ

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
МЕНСК, САВЕЦКАЯ 63,
3-І ПАВЕРХ, ПАКОЙ № 11.

Выданьне ЦК КП(б)Б. Рэдактар Э. ШАПІРА.

Друкарня імя Сталіна Заказ № 159. У ліку 9.000 экз. Уп. Галоўлітбелу А—№ 4